Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 СНЕЖНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 254 (29876)



ТРАГЕДЫЯ СПАЛЕНЫХ ВЁСАК
8-9

ПОМНІКІ ЛІТАРАТУРНЫМ ПЕРСАНАЖАМ
14



## КОРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў Беларускай чыгункі са 160-годдзем з дня яе заснавання.

• **Сярэдні заробак у Беларусі ў лістападзе склаў Br1648,2.**

• На рэках Беларусі адзначаецца рост узроўню вады.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый ШУЛЕЙКА, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:**

*«Гэты год прайшоў ва ўмовах няпростай палітычнай і эканамічнай сітуацыі. Тым не менш вобласць забяспечыла важкі ўклад у эканоміку краіны — больш як 11 працэнтаў аб'ёму валавога ўнутранага прадукту і прамысловай вытворчасці, практычна 22 працэнты валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі і амаль 14 працэнтаў аб'ёму накіраваных у асноўны капітал інвестыцый. Роля эканомікі вобласці ў фарміраванні рэспубліканскіх паказчыкаў штогод павялічваецца і ў 2022 годзе дасягнула максімальных значэнняў за апошнія некалькі гадоў. Па выніках гэтага года ў рэгіёне чакаецца выкананне двух мэтавых паказчыкаў — па тэмпах росту намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы і сукупных паступленнях даходаў у бюджэт. Таксама чакаецца выкананне ўстаноўленых заданняў па зніжэнні ўзроўню затрат на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі, уводу ў эксплуатацыю жылля (у тым ліку з дзяржпадтрымкай і жылля для тых, хто мае патрэбу), вытворчасці імпартазамяшчальных тавараў».*

# ПЛАНЫ КАСМІЧНЫЯ І ЗЯМНЫЯ
## абмяркоўваліся падчас рабочага візіту Прэзідэнта ў Расійскую Федэрацыю

**У апошні тыдзень адыходзячага года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочы візіт у Расійскую Федэрацыю. Па запрашэнні свайго калегі Уладзіміра Пуціна беларускі лідар наведаў Навукова-даследчы выпрабавальны цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына, размешчаны ў Зорным гарадку. Пасля прыезду ў Зорны гарадок кіраўніка дзяржавы віталі гендырэктар дзяржкарпарацыі «Раскосмас» Юрый Барысаў, начальнік Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына Максім Харламаў, выканаўчы дырэктар па пілатаваных праграмах Сяргей Крыкалёў. З імі ў тым ліку абмяркоўваліся далейшыя перспектывы беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў касмічнай сферы. Кіраўнік дзяржавы падрабязна азнаёміўся з работай цэнтра, сістэмай адбору і падрыхтоўкі касманаўтаў. Яму прадэманстравалі розныя трэнажоры, якія выкарыстоўваюць у гэтых мэтах.**



Фота БелТА.

На базе ў «Зорным» праходзяць адбор на палёт у космас і прэтэндэнткі ад Беларусі. Шэсць дзяўчат праходзяць разнастайныя тэсты і даследаванні. Чакаецца, што пасля Новага года вызначаць асноўнага і дублюючага кандыдата на палёт у космас. Медыцынская камісія выдасць адпаведныя рэкамендацыі 28 снежня, пасля чаго беларускі бок будзе вызначацца з прыярытэтнымі кандыдатамі.

Кіраўнік дзяржавы накіраваўся ў будынак з цэнтрыфугай, дзе якраз праходзіла трэніроўка адной з прэтэндэнтак у касманаўты ад Беларусі. Пасля гэтага Прэзідэнт агледзеў гідралабараторыю — вялікі спецыяльны басейн для трэніровак касманаўтаў. Гідралабараторыя аснашчана наборам эксперыментальных установак (габарытных макетаў модуляў), якія могуць змяшчацца на рухомую платформу і апускацца ў гідрабасейн для правядзення трэніровак. Усе эксперыментальныя ўстаноўкі выкананы ў натуральную велічыню з поўнай імітацыяй аб'ёмаў, унутраных і знешніх абводаў элементаў канструкцыі. Аляксандру Лукашэнку падрабязна расказалі аб працэсе трэніровак, асаблівасцях аснашчэння касманаўтаў. Кіраўнік дзяржавы сардэчна пагутарыў з касманаўтамі, сфатаграфаваўся з імі.

Прэзідэнт агледзеў трэнажор расійскага сегмента Міжнароднай касмічнай станцыі. Усё зроблена ў натуральную велічыню і паўтарае модулі, якія знаходзяцца на арбіце.

СТАР. 2

Эксклюзіў

**Аляксей БАГДАНАЎ:**

# «ДЭФІЦЫТУ НЕ БУДЗЕ»

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Аляксей Багданаў распавёў «Звяздзе» аб парушэннях антыманапольнага заканадаўства, сістэме рэгулявання цэн, асартыменце на прылаўках крам і росце цікавасці спажыўцоў да айчынных тавараў.**

СТАР. 4



Фота БелТА.

З нагоды

# ЛЯВОНІХА, МІНЧАНКА І ВУЛКАН

### Чым парадуюць «гаспадара» 2023 года беларускія селекцыянеры?

**Напярэдадні наступлення года Труса пагаворым аб любімым ласунку «гаспадара» 2023 года — моркве. Нескладана здагадацца, што менавіта морква — абавязковы атрыбут навагодняга стала ў гэтым годзе. А яшчэ яна, мабыць, — самая распаўсюджаная гародніна пасля бульбы ў зімовым рацыёне беларусаў (без яе ні суп не зварыш, ні салату не прыгатуеш).**

Вось мы і вырашылі ўдакладніць, што новага дачнікам, а таксама гаспадаркам і фермерам і ў канчатковым выніку спажыўцам прапануюць беларускія селекцыянеры, калі казаць аб гэтым караняплодзе. А таксама раскажам, што будзе з вашым здароўем, калі часцей уключаць моркву ў паўсядзённы рацыён, і прапануем цікавыя рэцэпты страў з галоўнага навагодняга караняплода-2023.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



# ПЛАНЫ КАСМІЧНЫЯ І ЗЯМНЫЯ

## абмяркоўваліся падчас рабочага візіту Прэзідэнта ў Расійскую Федэрацыю

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка цікавіўся ўсімі дэталямі, аж да таго, якое электрычнае напружанне ў модулях, як касманаўты разаграваюць ежу. Ён зайшоў унутр модуля «Зорка», фактычна апынуўшыся ўнутры станцыі, але толькі ў зямных умовах.

Кіраўнік дзяржавы асобна сустрэўся з беларускімі дзяўчатамі, адна з якіх адправіцца скараць космас. Прэтэндуюць на гэта Марына Васілеўская і Вікторыя Фідрус — бортправаднікі авіякампаніі «Белавія», Дар'я Міхнюк — дзяржаўны судовы эксперт з Брэсцкай вобласці, Вольга Герасімава — урач акушэр-гінеколаг з Баранавіч, Настася Лянкова — урач — дзіцячы хірург РНПЦ дзіцячай хірургіі і Вольга Масціцкая — малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікааргенічнай хіміі НАН Беларусі.

Прэзідэнту расказалі, што ўсяго было праведзена гутарак больш як з трыма тысячамі чалавек. У выніку на дадзеным этапе засталося шасцёра найбольш дастойных. Цяпер яны ў цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў праходзяць вочны медагляд. Праведзена ўжо больш за палову запланаваных даследаванняў. У дзяўчат высокі маральны дух і добры фізічны стан.

Аляксандр Лукашэнка раскрыў сакрэт, аб чым дамовіўся з гендырэктарам дзяржкарпарацыі «Раскосмас» Юрыем Барысавым. «Ён кажа так: ну, калі па здароўі пройдуць, то яны не згубяцца, будзем іх выкарыстоўваць у расійска-беларускім сегменце палётаў у космас. Таму вы не перажывайце. Хто не паляціць першы раз, паляціць наступны. Усім работы хопіць. Дзякуй вам вялікі. Думаю, мы з вамі яшчэ неаднойчы сустрэнемся. Хачу, каб у вас усё склалася. Вы не пашкадуеце, што трапілі ў гэты калектыў», — сказаў Прэзідэнт.


Фота БелТА.

Навукова-даследчы выпрабавальны цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына.

Беларускі лідар асабіста папрасіў ураджэнца Беларусі касманаўта Алега Навіцкага аб садзейнічанні ў падрыхтоўцы. Дзяўчаты падзякавалі за аказаную падтрымку і магчымасць быць у ліку прэтэндэнтаў на палёт у космас, пацвердзілі гатоўнасць з гонарам і годнасцю прадставіць Беларусь на МКС.

### «2023 ГОД БУДЗЕ САМЫ ШЧАСЛІВЫ»

Падчас свайго візіту ў Расію Прэзідэнт Беларусі прыняў удзел у нефармальнай сустрэчы лідараў краін СНГ. Месцам правядзення саміту выбрана Прэзідэнцкая бібліятэка імя Барыса Ельцына. Установа размешчана ў цэнтры Санкт-Пецярбурга ў гістарычным будынку Сінода на Сенацкай плошчы. Памяшканне бібліятэкі часта выкарыстоўваецца для правядзення падобнага роду сустрэч і самітаў. Нефармальныя сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — членаў СНД напярэдадні новага года ўжо сталі традыцыяй. Сабрацца ў Санкт-Пецярбургу ў канцы года Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін запрасіў сваіх калег яшчэ на саміце Еўразійскага эканамічнага саюза ў Бішкеку 9 снежня. Пасля прыбыцця на нефармальны саміт Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з журналістамі. Адказваючы на пытанне, якім будзе 2023 год, Прэзідэнт сказаў: «Самым шчаслівым, самым удалым. Не хвалюйцеся, будзе нармальна».

Прэзідэнты падвялі вынікі адыходзячага 2022 года, абмеркавалі планы па далейшым узаемадзеянні ў найбольш актуальных для Садружнасці сферах. На такіх сустрэчах лідары краін, як правіла, не прамаўляюць доўгіх праграмных прамоў, і частка, адкрытая для СМІ, абмяжоўваецца толькі пратакольнай заявай гаспадара саміту. Аднак тым і каштоўны падобны фармат, які дазваляе ў спакойнай, нязмушанай абстаноўцы яшчэ раз зверыць гадзіннікі па тых або іншых актуальных тэмах, выпрацаваць на перспектыву падыходы вырашэння пытанняў, якія стаяць на парадку дня.

Як заўважыў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, нефармальны саміт СНД сведчыць аб імкненні краін Садружнасці і ў далейшым выбудоўваць супрацоўніцтва ў духу павагі і партнёрства. Паводле ацэнкі Прэзідэнта Расіі, узаемадзеянне краін СНД у 2022 годзе развівалася паспяхова, што пацвярджае ўстойлівы рост тавараабароту: за студзень — кастрычнік ён павялічыўся на 6,6 працэнта да $81,5 млрд. «Ёсць падставы разлічваць, што па выніках бягучага года ён дасягне $100 млрд. Усё гэта адбываецца на фоне няпростай сітуацыі, выкліканай неспрыяльнай сусветнай эканамічнай кан'юнктурай, а таксама санкцыйным ціскам з боку некаторых краін», — адзначыў Уладзімір Пуцін.

Яшчэ адным ключавым напрамкам супрацоўніцтва ў СНД ён назваў умацаванне бяспекі і стабільнасці ў еўразійскім рэгіёне. Расійскі лідар падкрэсліў, што ўсе праблемныя пытанні краіны — члены СНД вырашаюць самі, аказваючы адзін аднаму таварыскую дапамогу і пасрэдніцкае садзейнічанне. Менавіта ў такім ключы краіны СНД узаемадзейнічаюць па тэматыцы барацьбы з тэрарызмам і экстрэмізмам, трансгранічнай злачыннасцю, незаконным абаротам наркотыкаў і карупцыяй.

Пасля афіцыйнай часткі ад імя расійскага кіраўніка для ўдзельнікаў сустрэчы быў дадзены ўрачысты абед.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

Нашы дзеці

# ПЕРАЕМНАСЦЬ У ДОБРЫХ СПРАВАХ

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА прыняў удзел у акцыі «Нашы дзеці», наведаўшы Маладзечанскую спецыяльную агульнаадукацыйную школу-інтэрнат, паведамляе БелТА.**

Цяпер у школе-інтэрнаце навучаюцца 85 выхаванцаў, з іх 22 дзеці-сіроты. Усе маюць праблемы са зрокам. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта прывёз навучэнцам ноўтбукі і салодкія падарункі. «Мы бачым, як з кожным годам, нягледзячы на ўсе цяжкасці, мяняецца наша краіна, як мяняецца цудоўны горад Маладзечна, — звярнуў увагу Ігар Сергеенка. — Віншую вас з Новым годам, жадаю, каб вы раслі разумнымі, добрымі, папраўлялі сваё здароўе, каб стаць сапраўднымі грамадзянамі нашай краіны».

Ігар Сергеенка расказаў журналістам, што ў акцыю «Нашы дзеці» ўцягнуты тысячы людзей. Але самае галоўнае — гэта дзеці, таму што ўсё робіцца для іх. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта лічыць, што ў школе створаны выдатныя ўмовы, ёсць прафесійны педагагічны калектыў. «Тое, што мы робім для нашых дзяцей, мы ўбачым праз дзясяткі гадоў. Цяпер гэтую акцыю праводзяць дарослыя, якія 25 гадоў таму былі дзецьмі, калі мы праводзілі першыя такія мерапрыемствы. Гэта і ёсць пераемнасць пакаленняў у добрай справе, якая абуджае ўсё самае добрае і здаровае ў нашым грамадстве», — лічыць Ігар Сергеенка. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што і сам акунуўся ў атмасферу свята. Ён ведае многіх выхаванцаў, а таму сустрэўся з імі як са старымі сябрамі.



Наталля КАЧАНАВА:

# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ, КАБ ДЗЕЦІ ВЫХОЎВАЛІСЯ БАЦЬКАМІ І БЫЛІ ЖАДАНЫМІ»

**У рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» Наталля КАЧАНАВА наведала сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Ленінскага раёна г. Мінска. Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала дзяцей з Новым годам і Калядамі.**


Фота БелТА.

Гэта не першая сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі з выхаванцамі сацыяльна-педагагічнага цэнтра. У мінулым годзе Наталля Качанава таксама наведвала яго, а некаторыя з дзяцей былі запрошаны ў Савет Рэспублікі.

— Мы ўжо сталі добрымі сябрамі. Расціце моцнымі, здаровымі, дружнымі: сябруйце, любіце адзін аднаго. Мы заўсёды будзем разам з вамі. У Новы год я хацела б выказаць падзяку нашым педагогам, якія працуюць у гэтай выдатнай навучальнай установе: няхай у вас будзе моцнае здароўе і душэўная цеплыня для выхаванцаў.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што дзяржава робіць усё, каб удзяліць увагу кожнаму з дзяцей:

— Для кожнага чалавека: дзіця гэта або дарослы — святочныя дні — гэта мары аб светлай будучыні. Мая галоўная мара — каб усе дзеці выхоўваліся бацькамі. І каб усе нашы дзеці былі жаданымі. Вось гэта самае галоўнае. Ні ў адной краіне няма столькі прынятых на заканадаўчым узроўні рашэнняў, якія дазваляюць падтрымліваць дзетак і даваць ім трошкі чалавечай цеплыні. Мы імкнёмся зрабіць так, каб яны верылі ў цуд, каб іх мары здзяйсняліся. Калі ты наведваеш такія цэнтры, то разумееш, што ў выхаванцаў толькі адна мара — быць дома з бацькамі. Няхай гэта спраўдзіцца.

Наталля Качанава прызналася, што ўдзел у акцыі «Нашы дзеці» дае ёй шмат станоўчых эмоцый:

— Толькі радасць і шчасце ад таго, што ўсміхаюцца дзеці. Важна, каб дзеткі былі здаровыя, каб яны раслі ў мірнай краіне. Зусім нядаўна па тэлебачанні я ўбачыла інтэрв'ю хлопчыка, які прыехаў на адпачынак у Беларусь разам з іншымі дзецьмі з Данецкай і Луганскай абласцей. Ён казаў, як тут у нас добра: ёсць вада, газ, святло. Гэтыя словы пранікаюць у сэрца вельмі глыбока, і разумееш, што мы павінны зрабіць усё, каб нашы дзеці ніколі гэтага не адчулі, каб яны жылі, як цяпер, у мірнай і шчаслівай краіне і заўсёды ўсміхаліся.

Да сустрэчы са Старшынёй Савета Рэспублікі дзеці падрыхтавалі навагоднія прадстаўленні, а спікер падаравала ім салодкія падарункі і сертыфікат на набыццё тэлевізара.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Блізкая ўлада

# «ДАПАМАЖЫЦЕ, ДОМ РАЗБУРАЕЦЦА!»

## Аб набалелым па тэлефоне і ўжывую

**Пытанні, што хвалююць жыхароў Гомельшчыны, разглядзеў старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО. Кіраўнік рэгіёна правёў прамую лінію і прыём грамадзян у Лоеве.**

Адно з актуальных пытанняў, адрасаваных падчас прыёму губернатару, датычылася працэдуры размеркавання арэнднага жылля. Неправамерная сітуацыя, калі заявы на некалькі кватэр прымаліся ад аднаго чалавека, была заўважана ў Брагінскім раёне. Іван Крупко адразу даручыў адказным службам дасканала прааналізаваць гэтае пытанне не толькі ў адзначаным раёне, але і ў рэгіёне ў цэлым.

— Трэба глыбока правесці ўлік, прааналізаваць, вызначыць рэгламент і правесці вучобу, на якой будуць агучаны ўсе нюансы, — падкрэсліў кіраўнік рэгіёна. — Па доме, дзе пацвердзіліся факты, ануляваць рашэнне і правесці працэдуру з захаваннем усіх норм.

Набалелая жыллёвая праблема вымусіла шукаць дапамогі ў кіраўніка рэгіёна таксама жыхарку пасёлка Суткова Лоеўскага раёна. Як расказала жанчына, двухкватэрны драўляны дом, у якім яна жыве, на балансе бальніцы.

— Мая кватэра прыватызаваная, другая палова — безгаспадарная. Дом стары, суседняя частка разбураецца, мая таксама. Звярталася з просьбай, каб прадалі мне другую палову, але пытанне не вырашылася, — адзначыла заяўніца.

Агучаную жанчынай сітуацыю кіраўнік рэгіёна ўзяў на асабісты кантроль.



— Вывучым сітуацыю, паглядзім, што можна зрабіць у рамках закона, — запэўніў Іван Крупко.

Адразу некалькі зваротаў, адрасаваных губернатару жыхарамі Лоева, датычыліся вядзення камунальнай гаспадаркі. Так, якасцю правядзення капітальнага рамонту ў доме вельмі не задаволены ветэран працы.

— Дах раскрылі месяц таму, і да сённяшняга дня ўсё цячэ. Сцены мокрыя, столі мокрыя, — з просьбай разабрацца ў сітуацыі звярнуўся заяўнік.

«У падвал зайсці немагчыма. Пах даходзіць да верхняга паверха», — апісаў сітуацыю, з якой вымушаны мірыцца жыхары другога дома ў Лоеве, яшчэ адзін заяўнік.

— З моманту засялення ў дом з 2019 года забіваецца каналізацыя ў падвале. Пісалі ў розныя інстанцыі. Аднак нічога не мяняецца, — запэўніў мужчына.

Прагучалі падчас прыёму таксама пытанні ўладкавання тратуарнай дарожкі па вуліцы Садовай у Лоеве і асвятлення ўчастка дарогі, якая вядзе да дзіцячага садка ў раёне жыллёвай забудовы.



Фота ТК «Гомельшчына афіцыйна».

Па ўсіх адзначаных адрасах для дэталёвага вывучэння праблем, з якімі сутыкнуліся грамадзяне, выедуць адказныя службы, запэўніў кіраўнік рэгіёна.

Па адным са зваротаў грамадзян — правядзенні каналізацыі ў раёне жыллёвай забудовы — старшыня аблвыканкама даручыў раённым уладам правесці сустрэчу з людзьмі, каб прыняць аптымальнае для ўсіх бакоў рашэнне.

Як нагадаў Іван Крупко, практыка вырашэння падобных сітуацый ужо выпрацавана ў райцэнтрах Гомельшчыны:

— Калі большасць людзей выкажуцца за, трэба ствараць кааператыў. Праектна-каштарысная дакументацыя вызначыць магчымасці добраўпарадкавання сістэмы, яе кошт, і жыхарам будзе зроблена растэрміноўка.

Па кожным звароце, атрыманым падчас прамой тэлефоннай лініі і прыёму грамадзян, Іван Крупко даў канкрэтныя даручэнні адказным службам.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Надвор'е

# СНЕГ З ДАЖДЖОМ І ГАЛАЛЁДЗІЦА, А 1 СТУДЗЕНЯ ДА +10 °C

**Галалёдзіцу, мокры снег і дождж абяцаюць сіноптыкі ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамілі БелТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

На Каляды надвор'е дало надзею, што апошні тыдзень снежня парадуе маразамі. Але пахаладанне аказалася нядоўгім, і ўжо ў панядзелак чарговая сістэма атмасферных франтоў з Заходняй Еўропы прынясе больш цёплае атлантычнае паветра. А гэта значыць, што ападкі зноў будуць пераходзіць са снегу ў мокры снег і дождж, што прывядзе да ўтварэння галалёду. Пры паступленні цёплага паветра будуць утварацца туманы. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу рабочага тыдня будзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў у начны час і ад нуля да плюс 6 градусаў днём», — расказалі ў Белгідрамеце.

У аўторак прагназуюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У начныя і ранішнія часы ў цэнтральных і ўсходніх раёнах, днём па ўсходзе краіны — галалёд. Тэмпература паветра ноччу будзе ад мінус 8 градусаў па паўночным усходзе да плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе. Днём — ад нуля да 6 градусаў цяпла.



У сераду месцамі па краіне мокры снег, дождж. У асобных раёнах слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра — ад мінус 4 да плюс 1 градуса. Днём чакаецца ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны сіноптыкі абяцаюць кароткачасовыя ападкі. У асобных раёнах слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 4 — плюс 2 градусы, днём — ад нуля да плюс 5 градусаў.

У пятніцу таксама чакаюцца мокры снег і дождж. У асобных раёнах слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а днём — ад нуля да плюс 5.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у апошні дзень адыходзячага года і ў першы дзень 2023-га паветраныя патокі возьмуць паўднёва-заходні напрамак, а тэмпературны фон яшчэ павысіцца.

У суботу месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі — мокры снег і дождж. У асобных раёнах туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 2 — плюс 3 градусы, днём — плюс 1—8 градусаў.

У нядзелю ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. У асобных раёнах слабы туман, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе ад 1 да 8 градусаў з плюсам, днём — ад 3 да 10 цяпла.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У МЗС Ірана паведамілі, што краіна не ўдзельнічае ў канфлікце ва Украіне

Іран не прымае ўдзелу ў канфлікце ва Украіне і лічыць пагрозы бездаказнай рыторыкай, сказаў афіцыйны прадстаўнік МЗС Ірана Насер Канаані. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».

«Абвінавачванне адных, другіх, Ірана не дапаможа Украіне, яе народу і кіраўніцтву. Мы абвяргаем абвінавачванні ўкраінскага кіраўніцтва», — дадаў іранскі дыпламат. Паводле яго слоў, Тэгеран ніяк не задзейнічаны ў канфлікце ва Украіне, але, пры гэтым, гатовы дапамагчы ў вырашэнні крызісу.

«Мы лічым бездаказнай пагрозліую рыторыку, ад якога б органа яна ні сыходзіла, і ўскладаем адказнасць за юрыдычныя і палітычныя наступствы такіх заяў на ўрад Украіны», — сказаў на заканчэнне Канаані.

Да гэтага ўкраінскія ўлады абвінавачвалі Тэгеран у пастаўцы Расіі беспілотнікаў, аднак ніякіх доказаў не прадставілі. Кіраўнік іранскага МЗС Хасейн Амір Абдалахіян падкрэсліваў, што Маскве была перададзена партыя беспілотнікаў яшчэ да пачатку спецаперацыі ва Украіне.

### NBC: колькасць загінулых у выніку снежнага шторму ў ЗША дасягае не менш як 46

Колькасць загінулых у выніку зімовага шторму ў ЗША па стане на вечар нядзелі, 25 снежня, складае не менш як 46 чалавек. Пра гэта паведамляе тэлеканал NBC.

Удакладняецца, што ахвяры непагадзі зарэгістраваны ў 12 штатах краіны. Сотні тысяч мясцовых жыхароў засталіся без электрычнасці.

Раней тэлеканал NBC паведамляў, што як мінімум 27 чалавек сталі ахвярамі зімовага шторму ў Злучаных Штатах, надвор'е пагаршалася ў большай частцы краіны. Да гэтага стала вядома аб 23 загінулых у розных інцыдэнтах, якія былі звязаны з зімовай бурай. Рэзкае паніжэнне тэмпературы, снегапады, моцны вецер, галалёдзіца сталі прычынай мноства аўтаварый.

Пры гэтым чатыры новыя выпадкі смерці адбыліся ў выніку ДТЗ з удзелам трох машын у штаце Агаё. У экстранным ведамстве пацвердзілі, што людзі загінулі ў выніку непагадзі.

24 снежня агенцтва Bloomberg паведамляла, што снежная бура, якая абрынулася на ЗША, прывяла да рэкорднага зніжэння здабычы прыроднага газу.

### Хакер заявіў аб узломе Twitter і запатрабаваў у Маска выкуп за звесткі карыстальнікаў



Хакер пад псеўданімам Ryushi, які сцвярджае, што ўзламаў Twitter, запатрабаваў ва ўладальніка і кіраўніка сацыяльнай сеткі Ілана Маска выкуп за асабістыя даныя карыстальнікаў. Кіберзлачынец заявіў, што атрымаў доступ да звестак 400 мільёнаў уліковых запісаў, паведамляе партал Security Affairs.

Па словах хакера, яму ўдалося атрымаць доступ да асабістай інфармацыі, выкарыстоўваючы платформу. База даных, якую ён выставіў на продаж у даркнэце, змяшчае электронную пошту, нумары тэлефонаў і іншыя персанальныя даныя.

Пры гэтым у якасці доказу прадавец даў пробны доступ да звестак аднаго тысячы карыстальнікаў. У прыватнасці, у выбарцы змяшчаецца інфармацыя аб акаўнтах прадпрымальніка Дональда Трампа-малодшага, спецыяліста па кібербяспецы Браяна Крэбса і іншых вядомых людзей.

Хакер прапанаваў Маску выкупіць базу даных. «Twitter ці Ілан Маск, калі вы чытаеце гэта, ужо рызыкуеце атрымаць штраф GDPR (Агульны рэгламент па абароне даных, які дзейнічае ў ЕС). Ваш найлепшы варыянт пазбегнуць штрафу за парушэнне GDPR — гэта купіць гэтыя даныя на эксклюзіўнай аснове», — заявіў хакер.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў ГУДКОВА Аляксандра Барысавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Мурынай Юліі Георгіеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# «ДЭФІЦЫТУ НЕ БУДЗЕ»

### «Найважнейшы састаў правапарушэнняў — злоўжыванне дамінантным становішчам на рынку»

***— Аляксей Ігаравіч, раскажыце аб парушэннях антыманапольнага заканадаўства, што былі выяўлены ў апошнія месяцы. Якія меры прыняты для абароны інтарэсаў усіх удзельнікаў рынку?***

— У рамках кантролю за выкананнем антыманапольнага заканадаўства, у тым ліку ў мэтах забеспячэння роўных умоў ажыццяўлення дзейнасці для гаспадарчых суб'ектаў, камісіяй Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь па ўстанаўленні факта наяўнасці (адсутнасці) парушэння антыманапольнага заканадаўства за дзевяць месяцаў 2022 года разгледжаны 53 справы, у выніку якіх устаноўлены шэраг фактаў наяўнасці парушэнняў у галіне нядобрасумленнай канкурэнцыі, злоўжывання дамінантным становішчам, а таксама парушэнні ў адносінах дзяржаўных органаў. Камісія з'яўляецца спецыяльна створаным калегіяльным органам, які прымае рашэнні аб наяўнасці (адсутнасці) факта парушэння антыманапольнага заканадаўства. Па выніках установленых фактаў парушэнняў антыманапольнага заканадаўства сума штрафных санкцый склала каля 42 тысяч рублёў. Прывяду некалькі прыкладаў установленых фактаў парушэнняў. Адно з расследаванняў закранула ўсім вядомы савецкі таварны знак «БУРАТИНО». Суб'ект набыў і выкарыстоўваў выключнае права на таварны знак «БУРАТИНО», перашкаджаючы пры гэтым выкарыстанню дадзенага таварнага знака канкурэнтамі. У выніку расследавання ўстаноўлены факт нядобрасумленнай канкурэнцыі і ў адрас парушальніка вынесена прадпісанне.

У сваёй дзейнасці МАРГ аналізуе розныя рынкі, у тым ліку і лічбавыя. Яшчэ адна справа датычылася нядобрасумленнай канкурэнцыі на рынку паслуг воблачных сэрвісаў. Суб'ект, які ажыццяўляе дзейнасць у галіне камп'ютарнага праграмавання, размясціў у сетцы Інтэрнэт артыкул «У Беларусі з'явіўся канкурэнт «воблаку» Amazon з кластарам за $40 мільёнаў». У ёй ён апісаў інфармацыю аб аказанні паслуг ва ўласным цэнтры апрацоўкі даных (ЦАД), якая ўтрымлівала недакладныя звесткі. Ведамствам устаноўлены факт наяўнасці нядобрасумленнай канкурэнцыі шляхам увядзення ў зман. Найважнейшым саставам правапарушэнняў з'яўляецца злоўжыванне дамінантным становішчам на таварным рынку. Так, неабгрунтавана адмовіўшы аднаму са спажыўцоў у заключэнні дагавора на аказанне паслуг, дамінант на таварным рынку па пахаванні цвёрдых камунальных адходаў стварыў дыскрымінацыйныя ўмовы да спажыўцоў паслугі па пахаванні цвёрдых камунальных адходаў. Гэтым і парушыў забарону на злоўжыванне гаспадарчым суб'ектам дамінантным становішчам.

**«Назіраючы станоўчыя эфекты новай сістэмы рэгулявання цэн, трэба адзначыць, па-першае, значнае запаволенне інфляцыі да 15,2 працэнта ў гадавым выражэнні па выніку кастрычніка, г. зн. толькі за адзін месяц зніжэнне інфляцыі склала 2,2 працэнтнага пункта, па-другое, чаканую актывізацыю спажывецкага попыту з-за зніжэння цэн на асобныя тавары».**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Акрамя прамых мер рэагавання ў мэтах аператыўнасці МАРГ прымяняе і меры прэвентыўнага характару. Так, за названы перыяд выдадзена дзесяць папярэджанняў у дачыненні да гаспадарчых суб'ектаў і дзяржаўных органаў. Папярэджанне прадугледжвае добраахвотнае выкананне гаспадарчым суб'ектам неабходных мер, накіраваных на ліквідацыю прыкмет парушэння антыманапольнага заканадаўства. У прыватнасці, МАРГ устаноўлены выпадкі нядобрасумленных паводзін суб'ектаў, якія займаюць дамінантнае становішча, пры рэалізацыі імі цукру і офісной паперы. Карыстаючыся сітуацыяй, якая склалася на рынку, і дынамікай узроўню цэн, такія дамінанты навязвалі контрагентам дадатковы асартымент тавараў, у якіх апошнія не былі зацікаўлены і што для іх з'яўлялася эканамічна нявыгадным. У выніку МАРГ выдадзены папярэджанні, якія выкананы ў поўным аб'ёме.



Фота БелТА.

### «Узровень цэн на тавары і паслугі, якія не рэгулююцца, ніжэйшы за ўзровень інфляцыі»

***— У кастрычніку ўведзена забарона на павышэнне цэн. Вы казалі, што Беларусь — адзіная краіна ў свеце, дзе рэгулюецца цана на больш за 50 % тавараў. Больш за тое, на некаторыя прадукты адзначаецца нават дэфляцыя. На якія тавары зніжаюцца цэны?***

— Новая сістэма рэгулявання цэн, увасобленая ў пастанове № 713 і іншых нарматыўных прававых актах, ахоплівае каля 85 працэнтаў усіх тавараў і паслуг, уключаных у спажывецкі кошык насельніцтва, а гэта каля 350 таварных груп: напрыклад, тавары мяса-малочнай групы, рыба, хлеб, крупы, адзенне, абутак, электратавары, парфумерна-касметычныя тавары і мыйныя сродкі і інш. З уступленнем у сілу пастановы № 713 у кастрычніку цэны на многія спажывецкія тавары сапраўды знізіліся. Найбольшымі тэмпамі — цэны на нехарчовыя імпартныя тавары, а таксама тавары бакалейнай групы. Напрыклад, па даных Белстата, мы бачым, што абутак за кастрычнік у сярэднім патаннеў на 2,8 працэнта, бытавыя электратавары — на 1,7 працэнта, легкавыя аўтамабілі — на 4,7 працэнта, крупы і макароны — на 2,9 працэнта, раслінны алей — на 2,6 працэнта.

***— Але што будзе з цэнамі надалей? Наколькі доўга іх можна ўтрымліваць на такім узроўні? І ці можна спрагназаваць, як забарона на павышэнне цэн адаб'ецца ў далейшым на эканоміцы краіны?***

— Асноўная задача на 2023 год — зніжэнне інфляцыі да адназначнага ўзроўню. Кіраўніком дзяржавы ўжо пастаўлена задача перад Нацыянальным банкам і ўрадам: скараціць інфляцыю да сямі-васьмі працэнтаў. Пад гэтую мэту ў пастанове № 713 і была выбудавана сістэма па рэгуляванні цэн на ўнутраным рынку. Назіраючы станоўчыя эфекты новай сістэмы рэгулявання цэн, трэба адзначыць, па-першае, значнае запаволенне інфляцыі да 15,2 працэнта ў гадавым выражэнні па выніку кастрычніка, г. зн. толькі за адзін месяц зніжэнне інфляцыі склала 2,2 працэнтнага пункта, па-другое, чаканую актывізацыю спажывецкага попыту з-за зніжэння цэн на асобныя тавары. Некаторымі экспертамі адзначаюцца і асобныя рызыкі, асноўнымі з якіх з'яўляюцца дыспарытэт цэн з Расійскай Федэрацыяй і ўзнікненне «шэрага» гандлю. Але МАРГ і іншыя дзяржаўныя органы, у сваю чаргу, будуць прымаць адпаведныя кропкавыя рашэнні па нівеліраванні негатыўных наступстваў, у тым ліку па насычэнні ўнутранага рынку. Некаторыя з рашэнняў у гэты час ужо адпрацоўваюцца на нашай пляцоўцы.

***— Якія тавары сёння лідзіруюць па росце цэн на іх?***

— Яшчэ раз нагадаю, што цэны на 85 працэнтаў тавараў і паслуг, уключаных у спажывецкі кошык насельніцтва, сёння рэгулююцца дзяржавай. У бягучых эканамічных умовах цэны на ўсе спажывецкія тавары (паслугі) у цэлым растуць аднолькавымі тэмпамі. Існуюць асобныя нерэгуляваныя пазіцыі, якія паступова з месяца ў месяц даражэюць: гэта бытавыя і платныя медыцынскія паслугі. Пры гэтым узровень цэн на нерэгуляваныя тавары (паслугі) ніжэйшы за ўзровень існуючай у краіне інфляцыі. Сярод бытавых паслуг адзначаецца рост тарыфаў на паслугі па рамонце абутку, рамонце бытавых электрапрыбораў, хімічнай чыстцы вопраткі і паслугі цырульняў. Гэта звязана з павелічэннем сабекошту прадукцыі, якая выпрацоўваецца, з прычыны росту кошту імпартнай сыравіны і матэрыялаў, выкарыстання паліўна-энергетычных рэсурсаў, змяненняў курсаў валют, праблем з лагістыкай. Што датычыцца медыцынскіх паслуг, то асноўнай прычынай з'яўляецца рост выдаткаў на аплату працы.

**«З уступленнем у сілу пастановы № 713 у кастрычніку цэны на многія спажывецкія тавары сапраўды знізіліся. Найбольшымі тэмпамі — цэны на нехарчовыя імпартныя тавары, а таксама тавары бакалейнай групы. Напрыклад, па даных Белстата, мы бачым, што абутак за кастрычнік у сярэднім патаннеў на 2,8 працэнта, бытавыя электратавары — на 1,7 працэнта, легкавыя аўтамабілі — на 4,7 працэнта, крупы і макароны — на 2,9 працэнта, раслінны алей — на 2,6 працэнта».**

### «Удалося спыніць зніжэнне продажаў айчынных тавараў»

***— Якія сферы ў найбольшай ступені закранула скарачэнне асартыменту? Ці сталі больш купляць беларускае ў сувязі са скарачэннем асартыменту на тыя ці іншыя таварныя пазіцыі?***

— У продажы — досыць шырокі асартымент усіх асноўных тавараў, якія дазваляюць у цэлым задаволіць пакупніцкі попыт. У сувязі з увядзеннем новай сістэмы рэгулявання цэн у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 713 адзначаліся выпадкі звужэння асартыменту па асобных відах нехарчовых тавараў, што звязана з перабудовай бізнес-працэсаў кампаній пастаўшчыкоў тавараў пад новыя ўмовы працы. У мэтах недапушчэння дэфіцыту і звужэння асартыменту тавараў, МАРГ вядзецца шырокая тлумачальная праца, ажыццяўляецца аператыўны кантроль за наяўнасцю ў суб'ектаў гандлю запасаў тавараў, прымаюцца меры аператыўнага рэагавання.

Пытанне папаўнення асартыменту імпартнай вытворчасці вырашаецца пашырэннем «лінейкі» тавараў беларускай вытворчасці. Так, у 2022 годзе ўпершыню за апошні шэраг гадоў удалося спыніць тэндэнцыю зніжэння долі продажаў айчынных тавараў, што сведчыць аб павелічэнні попыту пакупнікоў на айчынныя тавары. Па даных Белстата, за студзень — верасень бягучага года ўдзельная вага продажу тавараў айчыннай вытворчасці павялічылася ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 1,6 працэнта (з 59,5 да 61,1 працэнта). Напрыклад, значна вырас продаж айчынных яблыкаў — на 34,8 працэнта, шакаладу — на 7,0, макаронных вырабаў — на 8,9, піламатэрыялаў — на 23,6, керамічнай пліткі — на 27,5, тэлевізараў — на 28,7 халадзільнікаў і маразільнікаў бытавых — на 41,0, пральных машын — на 31,4, сродкаў бытавой хіміі — на 11,4 працэнта і многіх іншых тавараў. Павялічваецца таксама прысутнасць на паліцах расійскіх тавараў. Так, па даных Белстата, у студзені — верасні 2022 г. пры агульным зніжэнні імпарту спажывецкіх тавараў у Рэспубліку Беларусь (98 працэнтаў да студзеня — верасня 2021 г.) з Расійскай Федэрацыі завезена тавараў больш да ўзроўню студзеня — верасня 2021 года (102,1 працэнта).

***— Каб не дапусціць росту цэн, на сайце МАРГ запусцілі анлайн-форму для паведамленняў ад грамадзян. Ці шмат сігналаў ад спажыўцоў атрымана з моманту запуску формы? Наколькі эфектыўны гэта сродак зваротнай сувязі?***

— Так, на сайце МАРГ створана анлайн-анкета па пытаннях, звязаных з новай сістэмай рэгулявання цэн. Гэта як адзін з элементаў узаемадзеяння з бізнес-супольнасцю. Да нас паступаюць сігналы двух відаў: па растлумачэнні метадалогіі цэнаўтварэння, а таксама — прапановы бізнесу па карэкціроўцы дзеючай сістэмы. У МАРГ з моманту прыняцця пастановы № 713 паступіла больш за 10 тысяч зваротаў па ўведзеных падыходах, у тым ліку праз анлайн-анкету — 4 тысячы зваротаў. У краіне арганізавана шырокая тлумачальная работа: праводзяцца семінары па растлумачэнні пастановы № 713, распрацаваны і размешчаны ў адкрытым доступе восем «пакетаў» тлумачэнняў па найбольш частых пытаннях аб сістэме рэгулявання цэн, а таксама каментарыі ў фармаце «пытанне — адказ». Актуальныя пытанні рэгулярна асвятляюцца ў прэс-рэлізах, артыкулах і інтэрв'ю. Мы ўважліва ставімся да ідэй бізнесу, і калі яны не супярэчаць даручэнням кіраўніка дзяржавы па празрыстым рэгуляванні цэн, а толькі ўдасканальваюць бягучыя падыходы, то стараемся аператыўна ўкараняць іх у дзеючую сістэму. Своечасовая і якасная прапрацоўка пытанняў, што паступаюць, дазволіць у далейшым стварыць справядлівую, празрыстую і зразумелую для бізнесу сістэму цэнаўтварэння.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ЛЯВОНІХА, МІНЧАНКА І ВУЛКАН

## ЭЛІКСІР ЗДАРОЎЯ

Здавалася б, што цікавага можна сказаць аб такой «празаічнай» агародніне? Аказваецца, многае. Медыкі і спецыялісты правільнага харчавання сцвярджаюць, што рэгулярнае ўключэнне ў меню свежай морквы (чаго, дарэчы, большасць нашых суайчыннікаў не робіць — морква традыцыйна ўваходзіць у наш рацыён пасля тэрмічнай апрацоўкі) зніжае на траціну рызыку развіцця сардэчных прыступаў. Даследаванні пацвердзілі зніжэнне больш чым на 10 % узроўню халестэрыну ў крыві пры спажыванні 200 г сырой морквы штодня на працягу 20 дзён. І на цэлых 40 % морква скарачае верагоднасць злаякасных новаўтварэнняў у лёгкіх дзякуючы высокаму ўтрыманню бэта-караціну — яго ў дзень з ежай чалавек павінен атрымліваць не менш за 1,7 мг. Для лепшага засваення каштоўных рэчываў сырую агародніну важна спажываць у дуэце з тлушчамі (караціноіды тлушчарастваральныя, іншымі словамі, засвойваюцца разам з тлушчамі). Ідэальныя партнёры для морквы — раслінныя алеі (рапсавы, сланечнікавы, аліўкавы), а таксама смятана.

Акрамя агульнавядомага дабратворнага ўплыву на зрок, морква падтрымлівае здароўе печані, сэрца, сасудаў, страўніка, дае сілы пры сіндроме хранічнай стомленасці і дапамагае аднавіць рэпрадуктыўнае здароўе. І, дарэчы, актыўна выкарыстоўваецца не толькі ў кулінарыі, але і ў фармакалогіі.

Далёка не ўсім агароднікам, нават з вялікім стажам, вядома, што морква бывае розных колераў: існуюць сарты белага, жоўтага, ярка-чырвонага, ружовага, зялёнага, фіялетавага, бардовага і нават чорнага колераў. Па форме сарты морквы дзеляцца на авальныя, цыліндрычныя і канічныя, а па прызначэнні — на салатныя, пучковыя, для вытворчасці соку і прамысловай перапрацоўкі.



Калі сусветная мода на рознакаляровую бульбу ўжо дакацілася да нашых дачнікаў, то на падыходзе — мода на рознакаляровую моркву. І справа тут не толькі ў колеры. Напрыклад, фіялетавая морква змяшчае антацыян, які папярэджвае развіццё злаякасных пухлін і павышае імунітэт; чырвоная багатая лікапінам, што запавольвае развіццё катаракты; белая — гіпаалергенная (а таму ідэальная для маленькіх дзяцей), а жоўтая мае ў сваім складзе ксантафіл, які дапамагае пры цэлым шэрагу захворванняў унутраных органаў.



Ды і каштоўнасць самай звычайнай аранжавай морквы не толькі ў бэта-караціне, які, ператвараючыся ў арганізме ў вітамін А, аднаўляе зрок і ў цэлым дабратворна ўплывае на жыццядзейнасць клетак эпітэлія (дарэчы, чым ярчэй колер морквы, тым больш у ёй гэтага рэчыва). Морква таксама змяшчае біятын, найважнейшае рэчыва для абнаўлення клетак арганізма; фоліевую і пантатэнавую кіслоты (падтрымліваюць функцыю крывятварэння); вітаміны (С, групы В, К, Е, РР), а таксама натуральныя антыбіётыкі, фітанцыды і эфірныя алеі, якія валодаюць антыаксідантнымі ўласцівасцямі. Дададзім сюды багаты мінеральны склад і атрымаем сапраўдны эліксір здароўя. Менавіта каштоўны біяхімічны склад новых сартоў морквы — адзін з асноўных напрамкаў, у якім працуюць селекцыянеры Інстытута агародніцтва.

Пра тое, якія новыя сарты і гібрыды морквы створаны тут за апошнія гады, мы спыталі ў **загадчыка сектара сталовых караняплодаў РУП «Інстытут агародніцтва» кандыдата сельскагаспадарчых навук Васіля АПІМАХА.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## І СМАК, І КОЛЕР

***— Васіль Уладзіміравіч, раскажыце, калі ласка, аб новых сартах морквы, якімі спецыялісты Інстытута могуць ганарыцца. Над якімі сартамі і гібрыдамі гэтага караняплода зараз працуюць селекцыянеры?***

— Паспяховыя праекты апошніх гадоў — сарты морквы «Лявоніха», «Мінчанка», «Літвінка», з апошніх раянаваных распрацовак — гібрыд «Вулкан». Патрабаванні пры распрацоўцы новых сартоў — гэта ў першую чаргу высокі патэнцыял прадукцыйнасці, а таксама выдатныя смакавыя якасці, каштоўны біяхімічны склад, добрая лёжкасць. Зараз мы вядзём работу па некалькіх напрамках. Гэта стварэнне сартоў і гібрыдаў, прыдатных для мыйкі (роўны, доўгі караняплод даўжынёй 22—27 см), а таксама сартоў, якія падыходзяць для механізаванай уборкі (яны захоўваюць моцнае бацвінне ўвесь верасень і кастрычнік), і сартоў высокай лёжкасці, устойлівых да комплексу хвароб.

***— Якія якасці культывуюцца ў першую чаргу?***

— Важна спалучэнне комплексу прыкмет. І чым шырэйшы гэты комплекс, тым больш патрэб закрывае сорт або гібрыд. Ступень важнасці якой-небудзь прыкметы вызначаецца спажыўцом. Напрыклад, для чалавека, які любіць сокі з морквы, важная сакавітасць караняплода. Аднак калі ў караняплодах морквы будзе мала сухіх рэчываў, пацерпіць лёжкасць. Занадта сакавітыя ўзоры пры ўборцы і транспарціроўцы трэскаюцца — гэта значыць, набываюць нетаварны выгляд. Для вытворцы важныя такія паказчыкі, як ураджайнасць і таварнасць, а калі ён захоўвае караняплоды морквы, то неабходная добрая лёжкасць. Спажыўцу важны, па-першае, знешні выгляд, па-другое — смакавыя якасці. Утрыманне цукроў, караціну, вітаміну С абумоўлена фізіялогіяй расліны, а селекцыянер працуе ў дыяпазоне параметру прыкметы. У рэдкіх выпадках патрабуецца выйсці за рамкі дыяпазону прыкметы. Часцей гэта назіраецца ў рабоце на ўстойлівасць да хвароб. Сцвярджаць, што ёсць абсалютна ўстойлівы да ўсіх хвароб сорт — утопія. Рэальны варыянт — стварэнне сорту або гібрыду з аднаснай устойлівасцю да найбольш распаўсюджаных хвароб (бурая плямістасць лісця, мучністая раса і гэтак далей).

***— У Інстытуце бульбаводства стварылі сорт фіялетавай бульбы, а ці вядзецца праца над сартамі морквы незвычайных колераў? Чым, акрамя колеру, яны будуць адрознівацца ад звыклай морквы?***

— З традыцыйных распрацовак мы актывізавалі работу з узорамі морквы з канічнай формай караняплода (сортатып «Шантанэ»). Ён вельмі папулярны ў Расіі. З нестандартных распрацовак, разлічаных на больш вузкае кола спажыўцоў, — рознаафарбаваныя формы морквы: белая, жоўтая, чырвоная, фіялетавая. Акрамя колеру, што адрознівае іх ад традыцыйных аранжавых формаў, у іх ёсць і іншыя адметныя прыкметы: гэта можа быць больш ярка выражаны смак і пах (большае ўтрыманне эфірных алеяў) або лепшая ўстойлівасць да ліставых хвароб і гэтак далей. Працуем мы і з дробнаплоднай морквай, прызначанай у асноўным для спажывання ў свежым выглядзе, — гэта так званы «чыпсавы фармат». Асобным напрамкам ідзе вывучэнне спякотаўстойлівасці, засухаўстойлівасці, холадаўстойлівасці, устойлівасці да хвароб вегетацыі і захоўвання.

***— У сувязі са змяненнем клімату ці не ўзнікаюць складанасці ў нашых агароднікаў — дачнікаў, гаспадароў прысядзібных участкаў, а таксама гаспадарак з вырошчваннем морквы (такія складанасці часам узнікаюць у дачыненні да некаторых традыцыйных для нашых шырот культур)?***



— Асаблівых складанасцяў пры вырошчванні морквы ў новых умовах не назіраецца. Але, як адзначаў раней, па асобных напрамках мы вядзём работу (спякотаўстойлівасць, засухаўстойлівасць, халадаўстойлівасць). І ўжо ёсць узоры, якія паказваюць стабільную ўраджайнасць за некалькі гадоў незалежна ад умоў надвор'я.

## КУЛІНАРНЫ ПРАКТЫКУМ

Што прыгатаваць са, здавалася б, звычайнай морквы, на навагодні стол? Варыянтаў — мноства. Напрыклад, рознакаляровую моркву дастаткова проста запекчы ў духоўцы з аліўкавым алеем — атрымаецца незвычайны «ЗЛЖ-гарнір». Каб страва выглядала яшчэ цікавей, нават бацвінне можна не прыбіраць з караняплодаў цалкам. Перад падачай страву дастаткова проста пасыпаць здробненай зялёнай цыбуляй або шніт-цыбуляй. Але можна зрабіць што-небудзь больш складанае — напрыклад, традыцыйны «селядзец пад футрам», але «па-багатаму».

**Панскае «футра»**

Спатрэбіцца буйны селядзец, 3 бульбіны, 3 невялікія салодкія морквы, 2 яйкі, палова слоічка чырвонай ікры, маянэз і зеляніна (кроп і пятрушка). Бульбу, моркву і яйкі варым, рыбу чысцім, яе філе рэжам кубікамі. Салату выкладваем на плоскую талерку слаямі, кожны змазваем маянэзам. Слаі можна чаргаваць адвольна. Напрыклад, першы — бульба (надзёртая на буйную тарку), другі — селядзец, трэці — зноў бульба, чацвёрты — морква, пяты — яйкі, шосты — зноў селядзец, сёмы — зноў морква. Усё гэта зверху паліваем маянэзам і ўпрыгожваем ікрой і зелянінай. Даём салаце прапітацца і падаём на стол.

**Катлеткі «Заячая радасць»**

Бярэм паўкіло морквы, адно яйка, 2 ст. л. манкі, прыправы і соль па смаку. Вычышчаную моркву адварваем з лаўровым лістом, духмяным перцам і чорным перцам гарошкам. Пюрыруем у блендары (або на дробнай тарцы). Злучаем з яйкам, манкай, дадаём прыправы (чырвоны перац абавязкова, астатнія спецыі — па жаданні), солім. Запякаюць катлеткі ў духоўцы (200—220 °С) каля 20 хвілін. Падаюць са смятанай і зелянінай.

**Цукаты з морквы**

*(Фірмовы рэцэпт ад супрацоўнікаў сектара сталовых караняплодаў РУП «Інстытут агародніцтва».)*

2 кг вычышчанай морквы, 0,5 кг цукру (можна дадаць сок 1 лімона або апельсіна). У цукар трэба уліць крыху вады — да 100 г. Варыць сіроп 5—7 хвілін на сярэднім агні. У сіроп кладзём нарэзаную саломкай моркву і варым хвілін 5. Даём астыць і зноў варым 5—7 хвілін. Вымаем з сіропу моркву (сіроп спатрэбіцца для наступнай порцыі), раскладваем на прасушку. Сохнуць цукаты каля тыдня. У працэсе сушкі іх варта некалькі разоў перавярнуць.

— Але калі шчыра, то ў нас яны не паспяваюць высахнуць — з'ядаюцца раней. Выдатная замена цукеркам!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

УНП 700028385

**ЗАО «Центр промышленной оценки»**
**сообщает о проведении 10.01.2023 электронных торгов с 9.00 до 16.00 по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевский завод «Строммашина»**

| Количество лотов | Наименование имущества | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Задаток | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|
| 62 | Извещение о проведении электронных торгов и подробные сведения о реализуемых лотах в количестве 62 единиц (оборудование, транспортные средства, бывшие в употреблении) размещены на сайте **www.bankrot.gov.by** (в разделе «должники», «ОАО «Могилевский завод «Строммашина»», «реализация») и электронной торговой площадке **ipmtorgi.by** | Указана на сайте www.bankrot.gov.by | 10 % | 5 % |

Срок подачи заявок на участие в торгах: **09.01.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).**
Месторасположение имущества: г. Могилев, ул. Первомайская, 77.
Договор купли-продажи покупатель обязан подписать не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня завершения электронных торгов.
Срок оплаты предмета торгов: не позднее 7 рабочих дней со дня проведения торгов.
**Список реализуемого имущества и подробная информация о порядке проведения аукциона размещены на сайтах www.bankrot.gov.by и ipmtorgi.by**

Первичная профсоюзная организация общества с ограниченной ответственностью «Стальная сфера» прекращает деятельность в связи с ликвидацией (общество с ограниченной ответственностью «Стальная сфера» включена в ЕГР 23.09.2022, находится в процессе ликвидации).
Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65А, оф. 216Г»; УНП 100799172.

Первичная профсоюзная организация учащихся учреждения образования «Минский государственный профессиональный лицей № 10 строительства имени И. М. Жижеля» прекращает деятельность в связи с реорганизацией путем присоединения к учреждению образования «Минский государственный профессиональный лицей № 5 транспортного строительства».
Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220045, г. Минск, ул. Семашко, 11; УНП 100799172.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 19 января 2023 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 95,1 кв. м** в капитальном строении – здание отделения связи с инв. № 350/С-4458, помещение на 1-м этаже. **Адрес:** г. Гомель, пр. Октября, 81. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,3. Коэффициент месторасположения – 0,9 | **401,80** | 401,80 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76 |
| **Срок подачи заявления** | **С 27.12.2022 г. по 17.01.2023 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 – 4 (четыре) базовых величины согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %.**

**К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.**

**Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы:** юридическим или физическим лицом, а также индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

## Информация о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

УНП 600097530

| Номер лота. Местонахождение земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена, рублей |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1. д. Малая Сырмеж, ул. Туристская** | **0,2500** | **624083307801000196** | **Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** (для размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома) с объектами обслуживания) | **15000** |
| Дата, время и место проведения аукциона | **27 января 2023 г. в 11.00 аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (зал заседаний), Нарочский сельский исполнительный комитет** | | | |
| Извещение опубликовано | Официальный сайт Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by (http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/zemelnye-uchastki-v-chastnuyu-sobstvennost-01/)<br>Официальный сайт Государственного комитета по имуществу gki.gov.by (https://au.nca.by/search)<br>Официальный сайт Мядельского райисполкома http://myadel.gov.by/ru/sformirovan-ru/ | | | |

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «МИРАН-ПАРФЮМ»**

(УНП 100008993, г. Минск, ул. Бабушкина, д. 22, комн. 5),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 11 января 2023 года**.

Начало – 12.00. Заявки принимаются с 27 декабря 2022 года по 09 января 2023 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «МИРАН-ПАРФЮМ» (УНП 100008993)** в лице антикризисного управляющего – директора ООО «Деловой консалтинговый центр» Е.А. Поповой.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://bankrot.gov.by и http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 185 (29807) за 21.09.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 224 (29846) за 15.11.2022.

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «МИРАН-ПАРФЮМ»**

(УНП 100008993, г. Минск, ул. Бабушкина, д. 22, комн. 5),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 11 января 2023 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 27 декабря 2022 года по 09 января 2023 года, 16.00.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «МИРАН-ПАРФЮМ» (УНП 100008993)** в лице антикризисного управляющего – директора ООО «Деловой консалтинговый центр» Е.А. Поповой.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://bankrot.gov.by и http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 205 (29827) за 19.10.2022.

### ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ ОБЪЕКТА С ТОРГОВ

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона, назначенного на **29.12.2022, права заключения договора аренды помещения пл. 380,7 кв. м в капитальном строении с инв. № 610/С-1280 (магазин № 16), расположенном по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. 50 лет БССР, 15.** Продавец (арендодатель): ОАО «Веста-Борисов»

УНН 600012029

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 12 января 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 7; 22; 28; 29; 50) со снижением на 70 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021 г. № 184 (29553).**<br>**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 8–16; 19, 21, 24, 25; 27, 30; 32–35; 42–50) со снижением на 70 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.01.2022 г. № 15 (29637).**<br>**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 76 единиц оборудования (№№ лотов 8–21, 23–84) со снижением на 55 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810)** | | | |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 12 января 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 55 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**Условие продажи: 1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объекты продажи **(лоты №№ 1–6)** будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продажи прилагается). **Информация о земельном участке: лоты №№ 1–6** расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **8,5646 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания производственных зданий завода (для размещения объектов промышленности)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14071**, площадью **139,2 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование - **одноэтажное кирпичное здание для хранения легковоспламеняющейся жидкости.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | 6 660,00 | **666,00** |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14065**, площадью **1 159,5 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административно-бытовое здание.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/10. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 16.11.2015 № 320-00035/15-01 договор о залоге (ипотека) | 148 500,00 | **14 850,00** |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14066**, площадью **1 553,2 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административно-бытовое здание с пристройкой.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека) | 165 150,00 | **16 515,00** |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14068**, площадью **10 036,2 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание цеха новой техники с кирпичной отапливаемой пристройкой для ремонта шаровых кранов.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека) | 682 650,00 | **68 265,00** |
| 5 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14108**, площадью **12 563,1 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **цех металлоконструкций.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/9. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 24.02.2016 № 320-00003/16-01 последующий договор об ипотеке, договор об ипотеке от 30.05.2016 № 320-00013/16-01 | 811 350,00 | **81 135,00** |
| 6 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-37925**, площадью **44,3 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание проходной.** В состав лота входят: ворота механические (инв. № 20351), крановая эстакада (инв. № 792). Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/15 | 91 395,00 | **9 139,50** |
| 7 | Металлический склад для пропана (инв. № 60442), Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | 2 745,00 | **274,50** |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09 – Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893, к/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 27 декабря 2022 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10 января 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

Супрацоўніцтва

# ВУЧЫЦЬ ГІСТОРЫЮ ВАЙНЫ ДЗЕЛЯ МІРУ

**Універсітэцкі брэнд Гомельшчыны — міжнародная алімпіяда «Сусветныя войны ў гісторыі чалавецтва», якую ўжо больш як дзесяць гадоў праводзіць Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, — зрабіў свой унёсак у святкаванне Года гістарычнай памяці ў рэгіёне. Упершыню да ўдзелу ў міжнароднай алімпіядзе былі запрошаны не толькі будучыя прафесіянальныя гісторыкі і студэнты няпрофільных факультэтаў, якія захапляюцца вывучэннем гісторыі, але і тыя маладыя людзі, хто праходзіць навучанне па праграме ваеннай падрыхтоўкі ў ВНУ, і курсанты ваенных кафедр. Спаборнічаць у веданні ваеннай гісторыі студэнтам і іх выкладчыкам настолькі спадабалася, што алімпіяда прайшла, а гомельскія гісторыкі-выкладчыкі не перастаюць атрымліваць лісты са станоўчымі водгукамі і словамі ўдзячнасці за ўнікальны вопыт.**

## ПАМЯЦЬ — ПАДМУРАК

Як вядома, з пачатку гэтага навучальнага года студэнты дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны і дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога атрымалі магчымасць праходзіць ваенную падрыхтоўку на ваенна-транспартным факультэце БелДУТа. Як звярнуў увагу прарэктар па бяспецы, рэжыме і кадрах ГДУ імя Ф. Скарыны Аркадзь Куксо, кіраўнікі трох ВНУ абласнога цэнтра падпісалі дамовы аб новай форме ўзаемадзеяння. Такога віду дагаворы заключаны ў краіне ўпершыню. Міжвузаўскія пагадненні дазволяць павысіць узровень падрыхтоўкі студэнтаў па праграмах афіцэраў запасу, а для студэнтаў новая форма навучання дае магчымасць якасна выконваць задачы згодна з атрыманай ваенна-ўліковай спецыяльнасцю.

— У надзвычай абвостраны час падмены маральных паняццяў, дэмемарыялізацыі герояў, імкнення перапісаць падзеі і вынікі Другой сусветнай вайны, веданне гісторыі — гэта падмурак, на які могуць у ментальным, этычным, маральным планах абаперціся маладыя людзі, адказаць для сябе на галоўныя пытанні жыцця, — перакананa **кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі факультэта гісторыі і міжкультурных камунікацый ГДУ імя Ф. Скарыны Аксана ЯШЧАНКА**.



Фота ГДУ імя Ф. Скарыны.

## НОВЫ КАМПАНЕНТ І ШЫРОКАЯ ГЕАГРАФІЯ

Менавіта кафедра гісторыі Беларусі Гомельскага дзяржуніверсітэта, якую ўзначальвае Аксана Рыгораўна, ужо 12 гадоў запар арганізуе правядзенне міжнароднай алімпіяды па тэме «Сусветныя войны ў гісторыі чалавецтва». Апошнія гады спаборніцтвы праходзяць у дыстанцыйнай форме. Але гэта акалічнасць не толькі не пазбавіла алімпіяду папулярнасці, але і дала магчымасць ахапіць сваім рухам большую колькасць удзельнікаў. Так, у апошнім конкурсе прынялі ўдзел 190 чалавек, ці 38 каманд, а прадставілі яны 25 ВНУ Беларусі, Расіі і Узбекістана. Традыцыйна выступілі на алімпіядзе студэнты універсітэтаў усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама ўпершыню — з рэгіянальных ВНУ, з Пінска і Баранавіч. Ад Расійскай Федэрацыі ў спаборніцтвах бралі ўдзел студэнты з Навазыбкава, Смаленска, Пскова, Арэхава-Зуева (Падмаскоўе), Санкт-Пецярбурга. Упершыню ў ліку канкурсантаў былі студэнты з Узбекістана, якія прадставілі Тэрмезскі дзяржаўны ўніверсітэт.

— Новым кампанентам спаборніцтва стала выкананне шырокага блока пытанняў курсантамі і студэнтамі, якія вучацца па праграме ваеннай падрыхтоўкі ў ВНУ. Сярод іх — у тым ліку студэнты і курсанты ваенных кафедр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, — тлумачыць Аксана Яшчанка.

Гэта нававядзенне міжнароднай алімпіяды «Сусветныя войны ў гісторыі чалавецтва», безумоўна, удалося ажыццявіць дзякуючы стварэнню ў Гомелі новага вучэбнага кластара па ваеннай падрыхтоўцы студэнтаў паміж ГДУ імя Ф. Скарыны, дзяржаўным тэхнічным універсітэтам імя П. В. Сухога і БелДУТа. Усяго ў спаборніцтвах па гісторыі ўдзельнічала 12 ваенных каманд: яны выконвалі заданні конкурсу асобна ад студэнтаў гістарычных факультэтаў і студэнтаў няпрофільнага навучання.

— Гісторыя Першай і Другой сусветных войн на алімпіядзе раскрывалася на матэрыялах аб буйных ваенных аперацыях, подзвігах герояў і трагічных стратах, закраналіся пытанні мемарыялізацыі ваенна-гістарычнага мінулага ў розных краінах, выяўлялася веданне студэнцкай моладдзю прадметаў узбраення, працэсу музеефікацыі гісторыі сусветных войн, вызначалася арыентаванне ўдзельнікаў у падзеях Вялікай Айчыннай вайны на Гомельшчыне, — адзначае загадчык кафедры гісторыі Беларусі. — Курсанты і студэнты, якія вучацца па праграме ваеннай падрыхтоўкі, атрымалі заданні, якія былі арыентаваны не толькі на веданне гістарычнага ваеннага кантэксту, але і вайсковай справы.

## АСВЕТА

Пасля алімпіяды, дадае Аксана Яшчанка, сталі прыходзіць падзякі ад удзельнікаў алімпіяды і іх выкладчыкаў, пажаданні абавязкова быць зноў запрошанымі на спаборніцтвы.

— Першапачаткова, калі наш алімпіядны рух толькі зараджаўся, тэмай спаборніцтваў была абрана канкрэтная дата — вызваленне Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы імкнуліся заахвоціць прымаць удзел у алімпіядзе ВНУ рэгіёнаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі суседніх краін. Да ўдзелу запрашалі ўніверсітэты Гомельшчыны, Чарнігаўшчыны і Браншчыны, — ўзгадвае Аксана Рыгораўна. — Пасля стала відавочна, што ўзровень выкладання ваеннай гісторыі ў ВНУ розных рэгіёнаў адрозніваецца. У Беларусі заўсёды асабліва значны акцэнт падчас выкладання робіцца на курс гісторыі Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны, для беларускіх гісторыкаў-выкладчыкаў гэты курс — нязменнае правіла, святая святых, так бы мовіць, і гэта вельмі важна.

Пасля алімпіяд да гомельскіх гісторыкаў сталі звяртацца выкладчыкі замежных ВНУ — цікавіліся, у якой літаратуры можна знайсці інфармацыю па ваеннай гісторыі, напісаную апошнім часам беларускімі даследчыкамі.

— Мы зразумелі, што праз гомельскую алімпіяду ў тым ліку папулярызуем нашу айчынную гістарычную навуку, імкнёмся несці ідэі асветы аб ваеннай гісторыі для студэнтаў і выкладчыкаў іншых краін, — дзеліцца суразмоўца. — Сёлетняя алімпіяда па ваеннай гісторыі, як падзяліліся яе ўдзельнікі, набыла яшчэ і асаблівае гучанне ў кантэксце прыняцця Закона Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Навінкі кнігавыдання

# МАСТАЦКАЕ ВЫХАВАННЕ ЧАСОПІСА



**Ёсць розныя кніжныя жанры, якія аб'ядноўваюць мастацкія творы, скіраваныя на выхаванне ў чытача цікавасці да роднага слова, сарыентаваныя на ўрокі чытання і выхавання. Размова не пра падручнікі. Але размова пра тыя выданні, якія знаходзяцца на службе ў падручнікаў, з'яўляюцца іх памочнікамі. Так, ёсць вучэбны дапаможнікі, дзе месца і творам, і расповеду пра творы хапае. А ёсць — па сутнасці блізкія паміж сабою хрэстаматыі, чытанкі, тэматычныя і анталагічныя зборнікі. Пакінем чытачу права самому вызначыць жанр зборніка «Вясёлка», які толькі што выйшаў у выдавецтве «Адукацыя і выхаванне» і сабраў пад адной вокладкай лепшыя апавяданні, вершы, казкі, якія друкаваліся на працягу пяці гадоў у часопісе для дзяцей «Вясёлка». Зборнік па самой ідэі не новы, у яго былі папярэднікі. Хутка ці не бібліятэка з дзесяці кніг такога характару выбудуецца па выніках працы штомесячнага перыядычнага выдання. Дарэчы, усяго пабачыла (на снежань 2022 года) 790 нумароў часопіса «Вясёлка».**

Як вядома, доўгі час рэдакцыйны калектыў «Вясёлкі» ўзначальваў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі. Уладзімір Сцяпанавіч і выступае аўтарам адной з прадмоў да кнігі. Вось што ён піша: «Вам пашчасціла мець у сваёй бібліятэцы чарговы зборнік «Вясёлкі». Хочацца верыць, што многія з вас чыталі гэтыя творы ў часопісе. Цяпер вось — кніга! У ёй як бы ўвекавечаны тыя творы, з якімі вы знаёміліся зусім нядаўна ў школе ці дома. Яны засведчылі ваша дзяцінства, вашы творчыя інтарэсы, вашу цікаўнасць да казак, апавяданняў, малюнкаў, якія кранулі душу. І ў гэтых адносінах цяперашні зборнік «Вясёлкі» становіцца як бы помнікам вашага дзяцінства. Беражыце гэты духоўны скарб і перадайце яго сваім наступнікам, малодшым братам і сёстрам, а ў будучым — сваім дзецям...»

Дванаццаць раздзелаў у сапраўды анталагічным зборніку: «Сем колераў «Вясёлкі»; «Мая Беларусь»; «Карагод месяцаў»; «Дзецям пра ўсё на свеце»; «Нашы меншыя браты»; «Дружная сям'я»; «Тэатр Васі Вясёлкіна»; «Літаратурныя вандроўкі»; «Дні дзяцінства»; «Казка побач з намі!»; «Урокі «Вясёлкі»; «Хвілінкі-весялінкі». Усе яны — самыя што ні ёсць стратэгічныя кірункі ў выхаваўчай палітыцы выдання. Мяркуйце самі — тут і знаёмства з часопісам як з верным сябрам хлопчыка ці дзяўчынкі; тут і спасцісжэнне роднай старонкі, шырокі погляд на нашу Айчыну, напамін пра тое, якая багатая і бязмежная наша краіна; асэнсаванне свайго месца ў прасторы і часе — назіранні за наваколным асяроддзем, адрозненні часін года; адкрыццё новага, раней нязведанага, усялякія цікавосткі, кажучы сучаснай мовай, інавацыі; любоў да звяроў і птушак, пяшчотнае да іх стаўленне; адносіны са старэйшымі і паміж дзецьмі; разуменне, што не адны мы, беларусы, у свеце жывём, своеасаблівыя ўрокі інтэрнацыяналізму, адным словам, «сяброўства без межаў»... Ёсць і іншыя важныя кірункі не проста «вясёлкаўскай» праблематыкі, але і «вясёлкаўскай» педагогікі. Гэтая важная, праверaная гадамі і дзесяцігоддзямі стратэгія і перайшла з часопісных старонак у асобную кнігу.

Сёння ў краіне выдаецца не так і мала перыядычных выданняў, адрасаваных юным чытачам. Пералік іх можа быць не зусім кароткім. Гэта не ранейшыя часіны, калі выходзілі толькі «Вясёлка», «Бярозка», газеты «Піянер Беларусі» і «Зорька». Так, у прыватнасці, было да 1991 года... У перыёдыкі — газет і часопісаў — свае законы, у многім адрозніваюцца ад задач, якія вырашае кніга, якія ўвогуле вырашае мастацкая літаратура. Гэта звязана з жаданнем рэдакцыйных калектываў зрабіць інфармацыйна насычаныя выданні, фарміраваць іх змест, згодна з актуальнымі часу, не губляць надзённасць. А што такое надзённасць для дзіцячага літаратурна-мастацкага часопіса (дарэчы, «Вясёлка» пазіцыянуе сябе як «часопіс для дзяцей» і толькі)?.. Не будзем спяшацца адказваць на гэтае пытанне. Пошук адказаў пакінем педагогам. А вось што да практычных уяўленняў, то відавочнымі з'яўляюцца памкненні «Вясёлкі» весці мастацкае выхаванне чытача праз яркія, адметныя творы паэзіі, прозы, публіцыстыкі і нават драматургіі, незалежна ад часу іх напісання. Таму і суседнічаюць сярод публікацый мінулай пяцігодкі і адпаведна на старонках анталогіі, з якой мы зараз знаёмімся, творы Канстанцыі Буйло, Кандрата Крапівы, Эдзі Агняцвет, Цёткі, Янкі Купалы (шмат хто з якіх і ведаць не ведаў, што будзе з часам у беларускіх дзетак такое выданне, як часопіс «Вясёлка»), творы сучасных дзіцячых пісьменнікаў — Уладзіміра Мазго, Лёлі Багдановіч, Расціслава Бензерука, Леаніда Улашчанкі, Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, Тацяны Дамаронак, Генадзя Аўласенкі... Што заўважна (на крайні выпадак — гэта заўважна пры разглядзе кніжных старонак): нaперадзе — класіка, нaперадзе — творы, якія вытрымалі выпрабаванне часам. Дрэнна гэта ці добра?.. Класіка, творы, якія сапраўды на слыху, якія, магчыма, займелі сваё годнае месца ў школьнай праграме ці ў спісе пазакласнага чытання, творы, якія не аднойчы друкаваліся ў розных зборніках, якія перавыдаваліся ў кнігах класікаў ці проста добра вядомых, аўтарытэтных аўтараў ранейшых дзесяцігоддзяў, нясуць, несумненна, іншую, болей важкую сэнсавую нагрузку. І новаму чытачу, якому прапаноўваюцца перакануючыя мастацкія вобразы, параўнанні, сімвалы, знаёмства з імі толькі на карысць...

Прачытаюць хлопчыкі і дзяўчынкі верш Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць...» — і бацькі яго словы падхопяць. А мо нават і дзядуля з бабуляй таксама. Бо напісаны твор многія дзесяцігоддзі таму. І амаль паўвека верш Алеся Ставера, пакладзены на музыку славутым кампазітарам, народным артыстам Савецкага Саюза, загучаў песняй у выкананні ансамбля «Песняры»...

*Каб любіць Беларусь нашу мілую,*
*Трэба ў розных краях пабываць.*
*Разумею цяпер, чаму з выраю*
*Жураўлі на Палессе ляцяць.*

*Што ім тыя пагоды паўднёвыя!*
*Што ім пышны платанавы рай,*
*Калі клічуць іх далі сасновыя*
*І азёрны рабінавы край.*

Знаёмства з такімі творамі якраз можа быць сямейным. Бацькі, дзядуля ці бабуля змогуць пракаменціраваць юнаму чытачу адкрыццё таго ці іншага верша, будуць здольнымі расказаць нешта важнае, даволі істотнае для хлопчыка ці дзяўчынкі. А такія творы, як, напрыклад, верш паэта-франтавіка Івана Муравейкі «Іван з Беларусі», і ўвогуле ствараюць настрой на доўгую размову, на згадкі пра Вялікую Айчынную вайну, на магчымы зварот да сямейных легендаў, гісторый, звязаных з ваенным мінулым.

Знаёмства з новым томам «Вясёлкі» падказвае многія тэматычныя абсягі, якія чамусьці іншымі дзіцячымі перыядычнымі выданнямі проста абыдзены. А самае галоўнае: пагартаўшы «Вясёлку» ў адным маляўніча аформленым томе, над чым парупіўся вядомы кніжны графік Сяргей Волкаў, яшчэ болей пачынаеш разумець, што размова з юным чытачом і на старонках часопіса ці газеты павінна насіць мастацкі, вобразны характар, такая размова павінна прадстаўляць хлопчыкам і дзяўчынкам далёка не творы-аднадзёнкі.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца

# «УСЁ ЖЫВОЕ ПАЧАЛО ПЛАКАЦЬ...»

## Трагедыя населеных пунктаў, знішчаных гітлераўцамі падчас карнай аперацыі «Вясна—Поўнач» у Смалявіцкім і Лагойскім раёнах

**З наступленнем вясны 1943 года нарастаў партызанскі рух, павялічваўся лік людскіх і матэрыяльных страт нямецкіх войск ад падрываў эшалонаў, засад на дарогах і нападзенняў на гарнізоны. Партызаны зрывалі збор сельгаспрадуктаў у насельніцтва, які праводзіла нямецкая армія. Усё гэта трывожыла акупацыйныя ўлады, у красавіку 1943 года карныя аперацыі былі здзейснены супраць партызан Барысава-Бягомльскай зоны, куды ўваходзілі і партызанскія атрады, якія дыслацыраваліся ў Лагойскім раёне.**

Кіраўніцтва антыпартызанскай акцыяй ажыццяўляў брыгадэнфюрэр СС і генерал-маёр паліцыі Вальтэр Шымана, які часова выконваў абавязкі начальніка СС і паліцыі Беларусі. Спачатку ў Барысаўскім і Смалявіцкім раёнах з 2 па 6 красавіка прайшла карная аперацыя «Вясна—Поўдзень». Пасля гэтага карнікі блакіравалі мясцовасць у межах Барысаў — Смалявічы — Лагойск — Зембін — Барысаў. Так пачалася нямецкая карная аперацыя пад кодавай назвай «Вясна—Поўнач» (Lenz—Nord), за якой — трагедыі спаленых вёсак і расстраляных мірных жыхароў гэтага рэгіёна.

Пра гэтую карную аперацыю мала напісана ў літаратуры, але ў нямецкіх дакументах захаваўся загад на яе выкананне. Яна праводзілася з 7 па 14 красавіка 1943 года. Для здзяйснення злачынных мэт былі сфарміраваны чатыры баявыя групы і прыцягнуты значныя сілы. У першую групу ўвайшоў 2-і паліцэйскі полк СС, за выключэннем адной роты ад кожнага батальёна, якія засталіся праводзіць аперацыю па адпраўцы сельгаспрадуктаў і рабочай сілы ў Германію. У гэтую групу ўвайшоў таксама 202-і батальён ахоўнай паліцыі. У другой групе быў 13-ы паліцэйскі полк СС. Трэцяя група складалася з 1-га батальёна 23-га паліцэйскага палка СС і 57-га батальёна ахоўнай паліцыі. У чацвёртай групе знаходзіліся асобы батальён Дзірлевангера і рота ахоўнай паліцыі 11-га батальёна. У аперацыі таксама ўдзельнічала 12-я танкавая рота. Да ўсіх баявых груп далучылі каманды СД, якія дапытвалі захопленых палонных і маглі на месцы вырашаць іх лёс, а таксама прымалі рашэнне аб спальванні вёсак і расстрэле мясцовых жыхароў. Немцы паставілі мэту знішчыць партызан у гэтым раёне, разбурыць іх лагер і забраць у насельніцтва прадукты.

## Блакада

Баявая частка аперацыі пачалася 8 красавіка. У шэсць гадзін раніцы ўсе падраздзяленні выйшлі на зыходныя пазіцыі. Карнікі пачалі наступленне на партызанскую зону — у іх былі звесткі разведкі аб месцы знаходжання партызан. Немцы ведалі, што многія партызаны былі апранутыя ў нямецкую трафейную форму, таму загадалі сваім салдатам прышыць да левага пагона кавалак белай тканіны, каб сваіх было відаць здалёку. Атрад «Смерць фашызму»




Схема карнай аперацыі «Вясна—Поўнач».

пад кіраўніцтвам Васіля Тарунова, які базіраваўся ў раёне вёскі Мыльніца, спачатку трымаў абарону ўздоўж ракі Цна каля вёсак Сутокі, Чэмкі, Масцішча, Такаўшчына, але боепрыпасаў для доўгай абароны не хапіла. Пачыналася вясновае разводдзе, і сыходзіць у Гайнскае балота было ўжо нельга, бо з нямецкіх самалётаў уся водная роўнядзь з рэдкім хмызняком праглядалася і прастрэльвалася. Іван Дзёмін, будучы дырэктар Мінскага аўтазавода, а тады камандзір першай роты атрада «Смерць фашызму» ў сваёй кнізе піша, што Васіль Таруноў сабраў нараду ў вёсцы Масцішча, дзе тады знаходзіўся штаб, там было прынята рашэнне ўначы прарывацца на поўнач праз дарогу Зембін — Плешчаніцы. Перад світанкам першая рота і штаб атрада перасяклі гравійку Зембін — Плешчаніцы і спыніліся каля вёсак Нова-Ганцавічы і Ліпкі Лагойскага раёна, заняўшы там абарону. Але не ўсе партызаны змаглі тады выйсці з акружанага раёна.

Былы камісар атрада «Смерць фашызму» Іван Дзядзюля ў сваіх успамінах адзначаў: «Першым адправілі абоз з параненымі. Жыхароў папярэдзілі аб небяспецы верхавыя сувязныя. Першай і другой ротам было загадана, узяўшы курс на поўнач, адысці ў суседні Плешчаніцкі раён. Трэцяя рота заставалася для забеспячэння прыкрыцця з тылу. Пасля выканання гэтай задачы ёй належала адысці праз пралом на шашы, які ўтрымлівалі роты, што адышлі, таксама ў Плешчаніцкі раён. Першая рота і дапаможныя падраздзяленні атрада, прайшоўшы за ноч праз Масцішча, Такаўшчыну, Цну і Малінаўку, пад раніцу непрыкметна перасяклі шашу Зембін — Плешчаніцы і занялі абарону на прылеглых вышынях. У іх задачу ўваходзіла прыкрыць выхад другой і трэцяй рот. Другая рота, выходзячы правей у раёне Швабаўкі, натыкнулася на карнікаў. Пасля кароткай сутычкі Георгій Шчамялёў адвёў партызан у лес. Некалькі пазней ён зрабіў спробу прадзерціся праз невялікі лес паміж Швабаўкай і Цной, але і гэта не атрымалася. Тады Шчамялёў вырашыў адарвацца ад праціўніка, дачакацца ночы ў лесе і ўжо потым ізноў паспрабаваць праслізнуць на поўнач правей Зембіна. Рота, якую праследвалі карнікі, адыходзіла ў кірунку Гайненскага балота. Трэцяя рота да канца дня ўступіла ў бой з фашыстамі ў Юр'еве, стрымліваючы іх націск дацямна. Уначы яна адкацілася ў лес да былой вёскі Мыльніца...»

## Прарыў блакады

Роты Шчамялёва і Фамянкова не змаглі прарвацца праз нямецкі заслон і апынуліся ў акружэнні. Карнікі пачалі наступленне на Гайненскае балота, прачэсвалі мясцовасць уздоўж Гайны з боку Юр'ева і дарогі Плешчаніцы — Зембін, імкнучыся не выпусціць партызан з кальца. Рота Шчамялёва заняла абарону на вышыні ў раёне вёсак Мякестраўка — Рудня і ўвесь дзень адбівалася ад нямецкіх атак. Эсэсаўцы абстрэльвалі пазіцыі партызан з мінамётаў і гармат, а карэкціроўшчыкі паказвалі месца абстрэлу зялёнай ракетай, пушчанай у напрамку размяшчэння партызан. Народным мсціўцам удалося вызначыць нямецкія сігналы, і яны спынялі стральбу чырвонай ракетай, а затым самі пускалі зялёныя ракеты ў бок немцаў, тым самым прымушаючы варожых артылерыстаў абстрэльваць свае войскі. Уначы рота паспрабавала адарвацца ад карнікаў і адышла да балота. Мокрыя і галодныя партызаны не маглі нават развесці вогнішча. Манеўруючы па балоце, рота аказалася прыціснутай да разлітай воднай гладзі каля Гайны. Выхаду не было, і Шчамялёў прыняў рашэнне прарывацца праз нямецкія ланцугі. Стаіўшыся ў кустах, партызаны пачакалі, калі ланцугі падыдуць ушчыльную, а затым нечакана ў некалькіх месцах кінуліся ў рашучую атаку, змялі карнікаў і прарваліся да выратавальнага лесу.

У гэты час рота Фамянкова пад націскам карнікаў адыходзіла ў раёне Старога Млына да Гайны па вясновай вадзе. Прарвацца тут яны не маглі, бо немцы сцягнулі сюды вялікія сілы, а патроны ў партызан амаль скончыліся. Заставаўся толькі адзін шанц выратавацца — па ледзяной вадзе праз рэчку перайсці на другі бераг Гайны. Эсэсаўцы набліжаліся, і партызаны, дапамагаючы адзін аднаму, з цяжкасцю пераправіліся на выратавальны бераг. Многія партызаны загінулі, у тым ліку камандзір роты лейтэнант Іван Фамянкоў, які прыкрываў адыход і пераправу свайго падраздзялення. Усе тры роты атрада рознымі шляхамі прарваліся праз кальцо карнікаў.

Вінаватымі немцы зрабілі вёскі, каля якіх ішлі баі з партызанамі. Пачалося прачэсванне і зачыстка мясцовасці — запылалі ў агні хаты. Як гэта часта было, чорную справу ўзяў на сябе эсэсаўскі батальён штурмбанфюрэра СС Оскара Дзірлевангера. У батальёне былі сабраны разам нямецкія штрафнікі і былыя савецкія ваеннапалонныя, якія перайшлі на бок ворага.

Мясцовым жыхарам, акрамя лесу і балота каля ракі Гайна, якое запаўнялася адталай вадой, не было куды сыходзіць. Аднак схавацца ў балоце ў такі час было вельмі ненадзейна: яшчэ не вырасла трава, а кусты і дрэвы стаялі без лісця. Падчас гэтай карнай аперацыі былі знішчаны вёскі Смалявіцкага раёна, размешчаныя на мяжы з Лагойскім раёнам. 8 красавіка 1943 года фашысты спалілі Хаценава, там загінулі 184 чалавекі. 9 красавіка карнікі, якія наступалі з боку Юр'ева, знішчылі вёску Крывая Паляна, а затым прыгналі ў Сухі Востраў захопленых падчас прачэсвання балота людзей, што хаваліся там. Усіх іх забілі і спалілі разам з вёскай.

## Мякестраўка: людзей малацілі як снапы



Сведка трагедыі ў Мякестраўцы Іван МЫЦЬКО.

Некаторыя мясцовыя жыхары цудам ратаваліся. Сёння яны выступаюць сведкамі па крымінальнай справе аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Іван Васільевіч Мыцько нарадзіўся ў Мякестраўцы, цяпер жыве ў Маладзечне. Вельмі даўно ён хацеў расказаць пра знішчэнне сваёй вёскі, каб засталася памяць, тым больш што на месцы вёскі цяпер ужо нічога няма. Іван Мыцько падрабязна расказаў, як усё адбывалася ў той дзень: *«Мякестраўка складалася з васьмі двароў і праз горку яшчэ два. Усё здарылася 12 красавіка 1943 года — на агульным помніку, дзе ёсць і прозвішча бацькі, гэта напісана. Стала вядома, што ідзе блакада партызан. У нядзелю мужыкі сабраліся і пайшлі ў лес з вёскі. Дзесьці гадзін у дванаццаць дня немцы размясціліся ў Верб'і па хатах, накіравалі старасту ў Мякестраўку, каб прывёз двух бараноў, далі ўказанне сабраць яйкі і сала. Староста заданне выканаў. Людзям сказаў, што немцы нікога не крануць, калі партызан у вёсцы не будзе. Хтосьці збегаў да мужыкоў у лес, паведаміў ім гэта, і яны вярнуліся ў вёску. Як толькі пайшлі дадому, на іх месца ў лесе партызаны прыбылі. Гэта быў атрад «Смерць фашызму». Хтосьці немцам у Швабы паведаміў, дзе партызаны спыніліся. Карнікі пайшлі на Мякестраўку. Дзесьці гадзіны ў дзве глядзім, як з Верб'я, з лесу, высыпае ланцуг — карнікі ідуць. Не дайшоўшы да першых хат, спыніліся на дарозе, устанавілі мінамёты і пачалі міны кідаць — лічылі, што партызаны знаходзяцца ў хатах. У нас міна каля акна выбухнула, шкло пасыпалася, бацька закамандаваў нам на падлогу класціся. Немцы пакідалі міны, падняліся і пайшлі па агародах, мінулі вёску, у хаты не заходзілі. Падышлі да лесу і сталі паднімацца на ўзвышша, а там партызаны занялі зручную пазіцыю і адкрылі агонь, забілі некалькі чалавек, завязаўся бой. Бой працягваўся да цямна. З Рудні бацька ўзяў да сябе Аляксандра Мыцько з сям'ёй, бо адну частку Рудні раней спалілі, яшчэ ўзімку. Бацька з Аляксандрам пайшоў па сена ў хлеў — кароў пакарміць. Міма праязджаў на Верб'е верхавы, убачыў іх і сказаў: «Малаціце, малаціце сена, мы вас зараз размалоцім». Аляксандр на бацьку кажа: «Будзем уцякаць». Бацька адказвае: «А што будзе з сям'ёй?» Не захацеў кідаць сям'ю, і яны вярнуліся ў хату. Сёстры Ніна і Валя спалі за грубкай, у нас застаўся стрыечны брат Мікалай. У гэты час падышла да варот каманда смяротнікаў, і ў дзверы сталі стукаць: «Гаспадар, выходзь». Бацька, маці і я следам выйшлі ў двор. Там было двое верхавых і трое пешых. Бацька спытаў: «Вашых коней паставіць у хлеў або свайго даць?» Адказу не было. Ён пайшоў у хлеў і адчыніў дзверы, а ў гэты час яму стрэлілі ззаду ў галаву — бацька зваліўся на зямлю. Я пабег у хату і глядзеў праз акно. Карнікі крычаць: «Выходзь, другі гаспадар». Аляксандр выйшаў і пайшоў у хлеў, там гною за зіму шмат было. Наступіў на гной і прыхіліўся ў той момант, калі ў яго стрэлілі. Куля прайшла па плячы, прабіла вуха. Ён зваліўся на гной, галава ў крыві і ногі тырчалі з адрыны, але ён жывы застаўся. Яны засвісталі, засмяяліся і пайшлі. Маці не кранулі, яна пайшла да бацькі, але ён не адклікаўся, толькі енчыў. Праязджаў верхавы, пачуў стогны бацькі і дабіў яго. Ужо цёмна было, як вярнуліся карнікі, загадалі завесіць вокны і сказалі даваць вячэраць. Тут такое гора — а ім вячэраць падавай! Маці хацела ўзяць яйкі ў склепе, а адтуль яны ўжо нясуць кошык з яйкамі. Іх было шэсць чалавек, усе ў нямецкай форме. Размаўлялі на ўкраінскай і рускай мовах. Прынеслі з іншых двароў сала, хлеб, аплецены бідончык з самагонкай літраў на пяць. Наліваюць, выпіваюць і закусваюць. Мы з мамай стаялі каля печкі. Адзін дастае пісталет, з рукі на руку перакінуў, зарадзіў, коса на мяне паглядзеў. Я яго погляд на ўсё жыццё запомніў. Ён хацеў страляць у нас, але іншыя сказалі не рабіць гэтага, бо выпіваюць тут, а таму нядобра, калі трупы побач будуць ляжаць. Ён засунуў пісталет у кішэню. Потым карнікі падняліся і сабраліся сыходзіць, і адзін кажа: «Гаспадыня, магчыма, пальчаткі ў вас ёсць?» Гэта ён спытаў, каб адстаць ад іншых. На двары мароз — халодна было. Маці пальчаткі дастала і дала яму. Ён кажа ёй па-руску: «Уцякайце, заўтра ўсіх вас пастраляюць». Маці за рукаў яго і пытае, а куды ўцякаць? «У лес», — сказаў і пайшоў...»*

Жанчына сабрала дзяцей, і ўсе разам рушылі ў лес. Там у іх былі куфары схаваныя. Маці дастала цяплейшую адзежу, так да раніцы і пратрымаліся. Як пачало віднець, пачулі адзіночныя стрэлы, а потым убачылі, як хаты паляць. *«Як толькі пачалі паліць, усё жывое пачало плакаць: людзі крычалі, сабакі вылі, каровы раўлі — усё жывое падавала гукі, — успамінае сведка тых падзей. — Мы хаваліся ў балоце, а потым прытуліў нас бацькаў знаёмы ў вёсцы Вуглы. Рудню спалілі ў той жа дзень...»*

## Рудня: зямля хадзіла хадуном

Пасля таго як партызаны пакінулі займаную імі вышыню і накіраваліся ў балота, карнікі пачалі рухацца далей. Чарга надышла да Рудні. Гітлераўцы дашчэнту знішчылі ўсю вёску, расстралялі 90 жыхароў. Эсэсаўцы за свае страты ў баі жорстка пакаралі мясцовых жыхароў. Акалічнасці той трагедыі ўспамінае Зінаіда Таберка, жыхарка Рудні: *«Многія з Рудні пайшлі ў балота хавацца, у будках сядзелі, а немцы пачалі з гары страляць, мы сталі ўцякаць. Немцы ланцугом ішлі, усё прачэсвалі каля Гайны. Усіх жыхароў сагналі да сіласнай ямы, хто не ўцёк у балота, і пастралялі. Усе хаты папалілі. На наступны дзень мы прыйшлі з балота і сталі хаваць сваіх родных...»*

Людзей расстрэльвалі сем'ямі, у яме закопвалі ўсіх — і забітых, і жывых. Мясцовыя жыхары, якім пашчасціла выжыць, казалі, што ажно зямля калыхалася. Вось што расказвала аб тых падзеях Марыя Грынь: *«Мы тады былі ў балоце, дзе хаваліся ад немцаў. Цяпер страшна хадзіць у лес, а тады гэта выратаванне было. Прыйшлі карнікі і ўсіх з хат сабралі і пагналі да сіласнай ямы. Там усіх і расстрэльвалі. Адзін салдат сказаў, каб людзі ўцякалі, бо ўсіх паб'юць. Ну, а хто ж пабяжыць — у кожнага дзяцей па трое, чацвёра. А дзеці былі па паўгода, па гадку — усіх пабілі... Але адзін пабег, Герасім Мароз, гадоў 14 яму было, і выратаваўся. Па ім стралялі, але не забілі. Потым казалі, што зямля хадуном хадзіла: не ўсе забітыя былі, яны і жывых закапалі. Потым людзі прыйшлі з балота, забітых выцягнулі з ямы і пахавалі».*



Марыя ГРЫНЬ — адна з нямногіх жыхароў Рудні, якая цудам пазбегла расправы карнікаў.

На месцы расстрэлу жыхароў у Рудні стаіць невялікі абеліск. Карнікі забілі тут 90 чалавек, спалілі ўсе 57 дамоў вёскі.

## Стары Млын: пакуль немцы елі, людзі ўцякалі

Наступнай ахвярай карнікаў стала вёска Стары Млын. З Рудні яны суцэльнымі ланцугамі пайшлі ў бок гэтай вёскі, прачэсваючы мясцовасць уздоўж ракі Гайна. У гэтай вёсцы у той час жыла Леаніда Грынь. Вось што яна расказала: *«Наша вёска Стары Млын цягнулася адной вуліцай, яе перасякала маленькая рэчка Чарнавочка. За рэчкай былі тры хаты, а ўсяго ў вёсцы 12 хат. Я сваімі вачамі бачыла, як яны акружылі людзей на агародзе і ўсіх пагналі ў хату. Потым стары дзед, прозвішча яго Грынь, прыйшоў да нашага бацькі і кажа: «Лявонцій, уцякайце ў балота з сям'ёй, маю дачку ўжо забілі, я бачыў, як іх павялі ў хату і чуў стрэлы...» У тых трох хатах усіх забілі — тры сям'і. Чацвёртая сям'я згарэла з Рудні. Александрына Грынь, жонка вайскоўца, уцякла ў лес з двума блізнятамі і схавалася на краі балота, але яе знайшлі*



Помнік на месцы расстрэлу жыхароў у Рудні.



Зінаіда ТАБЕРКА — сведка трагедыі ў Рудні.

*і забілі, дзяцей маленькіх забілі стрэламі ў роцік... Падыходзяць немцы сюды, гоняць тры каровы. Я ў той час у акне стаю — бачу, што ўжо блізка падыходзяць. Я акно адкрыла і крычу колькі ёсць сілы: «Мама, хутчэй уцякайце». Яна малую на рукі Аню ўзяла, Вера сама палезла, і ўсе праз акно і пабеглі. Усё забыліся: і хлеб, і адзежу. Карова, свіння і дзве авечкі засталіся. Мы хутчэй агародам, за кусты і пабеглі ў лес. Хаваліся ў балоце, бацькі нас мохам накрывалі».*

Акрамя жыхароў трох хат, усе астатнія ўцяклі ў лес. Гэта стала магчымым дзякуючы мудрасці некаторых жыхароў, якія, каб выратаваць вёску, вынеслі стол на скрыжаванне. На стол паставілі тое, што мелі: яйкі, сала, яшчэ нешта з ежы... Пакуль карнікі елі, людзі, хто мог, пакінулі вёску. У Старым Млыне спалілі ўсе 12 хат, знішчылі 30 жыхароў.

## Мыльніца: людзей выманілі з лесу

Апошняй ахвярай нямецкай карнай аперацыі «Вясна—Поўнач» стала лясная вёска Мыльніца, якая падзяліла лёс Хатыні і з тых часоў так і не аднавілася. На шляху карнікаў паміж Старым Млынам і Мыльніцай быў хутар Града — там таксама забілі ўсіх жыхароў.

Месца, дзе калісьці знаходзілася вёска Мыльніца Лагойскага раёна, дагэтуль прыцягвае грыбнікоў і паляўнічых, проста аматараў прыроды. У вельмі прыгожым, маляўнічым месцы, акружаная лясамі, на схіле пагорка стаяла гэтая вёска. Сёння аб ёй нагадвае невялікі помнік з чорнага граніту, які ўсталяваны ў памяць аб жыхарах, забітых і спаленых разам з вёскай.

Гэты помнік пастаўлены крыху ў баку ад таго месца, дзе знаходзілася вёска. Недалёка ад вёскі знаходзіліся зямлянкі атрада «Смерць фашызму». У 1970-х гадах па ініцыятыве дырэктара Мінскага аўтазавода Івана Дзёміна тут была адноўлена зямлянка атрада, пабудаваны навесы і зроблены сталы. Улетку ў гэтым месцы ў пэўны дзень збіраліся былыя партызаны. Прыязджалі з розных куткоў краіны — ім хацелася пабачыць баявых таварышаў. Цяпер ужо няма каму тут збірацца...

| 3 | Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13263, площадь – 320,5 кв. м, назначение – Здание неустановленного назначения, наименование – Навес для хранения использованных покрышек, составные части и принадлежности – Навес для хранения использованных покрышек, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4 | 110191 |
| 4 | Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-11894, площадь – 608,9 кв. м, назначение – Здание нежилое, наименование – склад: подразделение общезаводские, составные части и принадлежности – склад арматурных изделий, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая | 110138 |
| 5 | Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-437, площадь – 19,2 кв. м, назначение – Здание неустановленного назначения, наименование – Насосная станция, бойлерная, подразделение РЭЦ, составные части и принадлежности – Насосная, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая | 110070 |
| 6 | Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13406, назначение – Сооружение неустановленного назначения, наименование – Внутриплощадочные сети хозяйства питьевого, составные части и принадлежности – Внутриплощадочные сети хозяйства питьевого, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, 4 | 330209 |
| 7 | Многолетние насаждения (Насаждения ограниченного пользования, расположенные по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая) | 00970244, 00970250, 00970249, 00970255, 00970251, 00970253 |

**Начальная цена продажи лота № 1 с учетом НДС (20 %): 55 030 594,80 (пятьдесят пять миллионов тридцать тысяч пятьсот девяносто четыре белорусских рубля 80 копеек),** задаток 5 503 059,48 бел. руб. (пять миллионов пятьсот три тысячи пятьдесят девять) белорусских рублей 48 копеек).

**Собственник имущества:** Открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудски с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1. www.mogilev.cci.by.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся в 31 января 2023 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104.

Последний срок подачи заявления – **30 января 2023 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов **31 января 2023 г.** с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778042, + 375296927492 (А1).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора.

# «БЕЗ ВЫДУМКІ РАМАН ЗАСЫХАЕ...»

## Уладзіміру Гніламёдаву — 85


Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Уладзімір Гніламёдаў... Яго імя сёння, бадай, у кожнага ў нашым грамадска-культурным асяроддзі выклікае бясспрэчнае прызнанне заслуг і павагу. Выдатны літаратуразнаўца і крытык, класік сучаснай беларускай навукі пра літаратуру, дасведчаны, харызматычны, мудры педагог, што выхаваў не адно пакаленне кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі — кандыдатаў і дактароў навук, якія паспяхова працуюць на гуманітарнай ніве Беларусі і шмат што вызначаюць у развіцці яе філалагічнай навукі.**

А ў апошнія гады знакаміты даследчык прыгожага пісьменства надзвычай ярка праявіў сябе і як празаік. Унікальнай з'явай на этапе навейшай літаратурнай гісторыі Беларусі стала сямейная хроніка пісьменніка. Яго раманы «Уліс з Прускі» (2006), «Расія» (2007), «Вяртанне» (2008), «Валошкі на мяжы» (2014), «Вайна» (2014), «Пасля вайны» (2021), «Праўда жыве пасярэдзіне» (2022) заключаюць у сабе адзнакі вялікага нацыянальнага беларускага эпасу.

Раманная эпапея Уладзіміра Гніламёдава — гэта гімн роднай зямлі і яе народу, гімн духоўна-філасофскім традыцыям і каштоўнасцям беларусаў. Вельмі цікава і павучальна разам з самім пісьменнікам ці з яго дапамогай зазірнуць у творчую лабараторыю аўтара, пазнаёміцца з характэрнымі прынцыпамі яе работы, важнымі складнікамі яго працы.

***— Уладзімір Васільевіч, з чаго ўсё пачалося? Калі ў вас з'явілася жаданне выказацца, напісаць пра тое, што вы ведаеце, адчуваеце і бачыце?***

— Падспуднае амбіцыйнае жаданне падзяліцца сваімі думкамі з'явілася ў мяне даўно, яшчэ ў студэнцкую пару, калі я назіраў за лёсамі людзей, за тым, як ставіцца да чалавека свет. Стрымлівала сціпласць і рэгламентаваная эстэтыка, якую мала каму з пісьменнікаў удавалася парушыць, не ставала творчай свабоды. Я імкнуўся шырэй глядзець на свет, не спыняўся перад горкай праўдай. Ёсць безліч выказванняў, што такое літаратура, але няма вызначэння вычарпальнага. Лепш за ўсіх сказаў Данііл Гранін: «Ніхто не ведае, што такое літаратура». Проза, асабліва раман, тлумачыць жыццё, імкнецца ўстанавіць ісціну, даць пісьменніку магчымасць выказацца. Праз літаратуру, з дапамогай літаратуры адбываецца



нейкая важная камунікацыя паміж пакаленнямі, і ў гэтым яе незаменнасць.

***— Чым вы кіраваліся, ад чаго адштурхоўваліся, беручыся за свайго «першынца» — раман «Уліс з Прускі», які, памятаецца, гэтак здзівіў і ўразіў чытача?***

— Альбер Камю — класік XX стагоддзя — у сваёй Нобелеўскай прамове сказаў: «У маіх вачах мастацтва — неадасобленая асалода для выбраных. Яно з'яўляецца сродкам выклікаць хваляванне ў найбольшай колькасці людзей, прапануючы ім выключныя вобразы пакутаў і радасці, уласцівыя ўсім. Значыць, яно падпарадкоўвае сябе праўдзе — самай сціплай і самай усеагульнай».

Гэта тое, даруйце за нясціпласць, чым я кіраваўся.

***— Калі не сакрэт, хто падтрымаў вас, можа быць, падбадзёрыў на першых, мабыць, самых складаных этапах практыкі празаіка?***

— Пісьменнік выкарыстоўвае свой жыццёвы досвед, у аднаго гэта больш прыкметна, у другога менш, на што звярнуў маю ўвагу Уладзімір Калеснік, чые лекцыі я слухаў у Брэсцкім пядінстытуце і з кім (хоць і не блізка) знаўся. Ён першы пасля адной з нашых шчырых сустрэч сказаў мне: «Пішы!» Потым, пасля часопіснай публікацыі, падтрымалі мяне Іван Навуменка, Алег Лойка, Віктар Каваленка, Васіль Жураўлёў, малады тады Анатоль Казлоў, які надрукаваў мяне ў «Маладосці». Пісаць падштурхнула «перабудова» 1980-х гадоў, якая рэзка пашырыла сектар творчай свабоды.

***— Уладзімір Васільевіч, мы ведаем, што ніводзін з пісьменнікаў не пачынае, так бы мовіць, з чыстага аркуша паперы, на яго ў той ці іншай ступені ўплываюць вопыт папярэднікаў, традыцыі. На якія творчыя ўзоры вы арыентаваліся, чаму абралі менавіта раманную жанравую форму аповеду? Для мяне, напрыклад, гэта было вельмі нечаканым...***

— Прызнаюся, калі працаваў над «Улісам з Прускі», спрабаваў прыглядзецца і ўчытацца ў славуты джойсаўскі «Уліс». Магчыма, нешта пераняў, у чым, аднак, не ўпэўнены. Хацеў быць маторным і лаканічным, але мае намеры асаджваў сам матэрыял. Я не палічыў патрэбным вынаходзіць нейкія новыя формы, новыя словы. Зрэшты, мне гэта не пад сілу. Зразумеў аднак, што раманаў столькі ж, колькі раманістаў. Гэтым, як сёння кажуць, мемам і кіраваўся. Апроч усяго, дапамагаў, як ні дзіўна, і сам жанр. Раман, як вядома, валодае сваёй, не падкантрольнай аўтару, логікай і сілай. Гэта адчуваеш у час працы.





***— Нашы даследчыкі ў сучаснай беларускай літаратуры вылучаюць некалькі відаў ці тыпаў раманнага жанру. Які тып рамана вы выршылі развіваць і чаму, што хацелі зрабіць у ім асноўным?***

— Мы з вамі неаднойчы гаварылі пра тое, што беларуская літаратура спрадвеку збівалася на трэн, на плач, я імкнуўся пазбягаць жаласных нот, захаваць бадзёрасць і аўтэнтычнасць. Памятаў аднак словы Пушкіна пра Радзішчава: «Нет убедительности в поношениях, и нет истины, где нет любви». Працуючы, зразумеў, што пісьменніцтва — ледзь не адзіная магчымасць захаваць адыходзячы, павернуты ў мінулае, асуджаны на знікненне і на вачах знікаючы свет, аднак мінулае, пражытае патрабавала аналітычнага ўспрымання, «незамыленага», як цяпер кажуць, погляду, а нярэдка і перайначвання агульнавядомага.

Ад нашага, і не толькі ад нашага, пакалення была схавана, утоена гісторыя Беларусі. Не буду ўдавацца ў падрабязнасці, скажу толькі, што гісторыя нашага народа — гэта ў значнай ступені ланцуг паразаў, але ён выжыў. Я імкнуўся да інфармацыйнай насычанасці, хацеў стварыць сваю суб'ектыўную версію нашай навейшай гісторыі на падставе асабістага досведу і досведу свайго пакалення. Некаторыя чытачы мне казалі: ты хочаш стварыць нацыянальна-культурны код Беларусі. Мне гэта не па сілах, аднак, думаецца, што асобныя тыповыя і паказальныя трэнды часу я ўлавіў.

Мой дзядуля Лявонцій Міхайлавіч Сцепанюк у маладосці, на пачатку XX стагоддзя, кінуўся ў ЗША, прабыў там сем гадоў, з 1906-га па 1913-ы. Працаваў цяжка, але здолеў расплаціцца з даўгамі, якія накапіліся, калі будаваў хату, — вясемсот рублёў царскімі. Высылаў праз банк. У дзяцінстве і пазней я часта чуў яго ўспаміны. Дзе толькі ні працаваў! Паказаў сябе чалавекам трывалым і жыццястойкім. У Штатах сустрэў нямала цікавых людзей, у тым ліку земляка свайго Андрэя Кляновіка. Лявон Кужаль і Андрэй Кляновік — людзі новага часу — зразумелі: каб жыць, трэба дзейнічаць. Але жылі і дзейнічалі кожны па-свойму. З гэтага я і пачаў. Кожны займаецца сваім, робіць сваё. Свет — сукупнасць магчымасцяў.

***— У чым вы бачыце, калі можна так сказаць, сваю асноўную заслугу як пісьменніка?***

— Мае раманы — не «аўтафікшн». Я не спыняўся і перад тым, каб інвеставаць у творчы працэс розныя думкі і фантазіі, таму што без выдумкі раман засыхае. Галоўную сферу пісьменніцкай увагі бачыў найперш у чалавеку, у яго характарах, думках і ўчынках, у яго лёсе. Пры гэтым мяне цікавіла і гармонія чалавечага духу, і яго цёмныя глыбіні. Сучаснае мастацтва, у тым ліку і літаратура, часта адрасуюцца на ўспрыманне падсвядомасцю. Я пайшоў больш традыцыйным шляхам, арыентуючыся на рэалізм. Архаіка ў маёй свядомасці змагалася з мадэрнам і наадварот. Што ўрэшце атрымалася, меркаваць вам.

Зараз геніяў не відаць, але агмень у родным доме не павінен гаснуць і астываць, каб, калі хто аб'явіцца, не пачынаў на голым месцы. Рады буду, калі мае меркаванні з'явяцца нагодай для дыскусіі як матэрыял і інструмент міжасабасных навуковых стасункаў.

***— Над чым вы працуеце зараз?***

— Цяпер працую над апошнім, заключным творам пад умоўнай назвай «Дарагое жыццё», у якім дзейнічаюць і тыя ж, і новыя героі.

***— Вялікі дзякуй вам, дарагі Уладзімір Васільевіч, за шчырыя і глыбокія адказы! Сардэчна віншую вас з юбілеем і жадаю новых навуковых і творчых здабыткаў!***



**Мікола МІКУЛІЧ.**

Незвычайная вандроўка

# КАЛІ ГАННА ЧАРНУШКА ЗАБРАНЗАВЕЕ, А МАШЭКА СКАМЯНЕЕ...

## Гайд па беларускіх скульптурах літаратурных персанажаў

**У старым савецкім мультфільме пра падарожжа хлопчыка Нільса з гусямі ёсць уражлівы эпізод: Нільс апынаецца ноччу ў старым горадзе, дзе ажываюць скульптуры... Адны добрыя, другія ганарыстыя — з дрэва, з бронзы, з каменю — у кожнай свой характар і свая гісторыя...**

Я часам уяўляла такую ж сітуацыю. Праўда, у маім маленстве помнікаў у родным Мінску было не так ужо шмат... У асноўным — афіцыёзныя... Вось зараз уявіць падобную містычную сцэну захапляльна — столькі з'явілася цікавых скульптур, у тым ліку так званых гарадскіх. І не толькі ў гонар канкрэтных людзей, але і літаратурных персанажаў.

Падобныя скульптуры могуць узнікнуць нечакана, у нейкім дворыку, на тэрыторыі ўстановы... Не ўсе ўнесеныя ў афіцыйныя рэестры, не ўсе аднолькавай мастацкай вартасці... Але ўпрыгожваюць наша жыццё. Давайце сёння зробім віртуальнае падарожжа па беларускіх помніках літаратурным персанажам.

### Сымон-музыка і дзед Талаш

*«...Ён са скрыпкай*
*неразлучны,*
*Не спускае яе з рук,*
*А ў час вольны і спадручны*
*Граў і цешыўся хлапчук.*
*А як часам горка стане*
*Ці засмуціцца чаго,*
*Скрыпку ўспомніць —*
*сонца гляне,*
*Асвятляючы ўсяго».*



Як грае на скрыпцы герой паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка», можна наяве пабачыць на плошчы імя паэта ў Мінску, дзе знаходзяцца самыя, бадай, вядомыя помнікі літаратурным героям. У 1972 годзе, да 90-годдзя Якуба Коласа, тут былі ўсталяваныя яго помнік і выявы герояў яго твораў — аповесці «Дрыгва» і паэмы «Сымон-музыка». Ляпіў коласаўскіх персанажаў Заір Азгур. Бронзавы Сымон грае на скрыпцы, яго слухае сяброўка Аленка, а дзед Талаш разам са сваім баявітым унукам выглядаюць ворага.

Дарэчы, гэта не адзіная матэрыялізацыя коласавых герояў. У мемарыяльных сядзібах Коласа на Стаўбцоўшчыне ёсць мастацкі комплекс драўляных скульптур «Шлях Коласа», створаны па ініцыятыве Стаўбцоўскага райвыканкама і музея Якуба Коласа ў 1990—1992 гадах.

### Жыхары мележаўскіх Куранёў

*«З аблічча — дык як вылітая: і невялікая ростам, і не гладкая — худая, можна сказаць, і плечы, як у маткі, вузкія, і рукі тонкія»...*

Калі Дзень беларускага пісьменства ў 2010 годзе праходзіў у Хойніках, там была адкрыта скульптурная кампазіцыя па творах Івана Мележа, які родам з тых мясцін. Героі «Палескай хронікі», зробленыя скульптарам Валерыем Кандраценкам у бронзе і граніце, гэтым разам пасяліліся не на балоце, а пасярод гарадскога парку. Хоць скульптура так і называецца — «Людзі на балоце». Чароўная Ганна Чарнушка ў вясельным вянку слухае, як яе любы Васіль іграе на дудачцы, за яе спінай — аднавяскоўцы з Куранёў: стомленая сялянка хавае рукі пад фартух, а малы хлопчык узіраецца ў далеч... А вакол — роднае Палессе!

### Лепельскі цмок

Колькі разоў гаварылася, што менавіта героі Уладзіміра Караткевіча вартыя ўвасобіцца ў скульптурах! У 2002 годзе ў Оршы нават адбыўся пленэр па скульптуры, удзельнікі якога натхняліся творамі Караткевіча. Але пакуль што адзіны персанаж, помнік якому стаў сапраўды папулярным, — не самы цэнтральны для сюжэту, і ўвогуле дзіўны... Хоць Караткевіч у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» змясціў яго дакладнае апісанне: *«Выглядам той цмок быў, як звер фока (цюлень), такі самы льсняны, у складках, толькі без поўсці. І шэры, як фока. Але даўжэй за яго куды... Тулава мелі тыя цмокі шырокае і трохі пляскатае, і мелі яны плаўнікі — не такія, як у рыбы, а такія таксама, як у фокі, таўстамясыя, шырокія, але не дужа доўгія. Шыю мелі, па тулаву, дык тонкую і надта доўгую. А на шыі сядзела галава, адначасова падобная і на галаву змяі і на галаву лані. І, дальбог, смяялася тая галава. Мо проста зубы скаліла, а мо — з нашых бедаў. І зубы былі велічынёй з конскія, але вострыя, і многа іх было на такую галаву аж данельга. Вочы вялізныя, як сподкі, каламутна-сінія ў зелень, ашклянелыя. І страшна было глядзець у тыя вочы, і мурашкі па спіне, нібы Евінага змія ўбачыў, і непамысна неяк, і нібы ў чымсьці вінаваты».*

І цяпер на беразе Лепельскага возера можна знайсці таго самага Цмока, толькі бронзавага і лагоднага. Скульптар Леў Аганаў пастараўся дакладна ўлічыць апісанне Караткевіча.

### Ёлуп хвашчоўскі

А вось помнік гэтаму персанажу з твораў Караткевіча насамрэч папярэднічаў стварэнню вобраза.

У рамане «Чорны замак Альшанскі» Караткевіч піша: *«У вёсцы Фашчаўка была калісьці ў сярэднія вякі езуіцкая місія і поруч яе стаяла на высокай калоне статуя. Удзячны народ забыўся, хто гэта: святы ці нейкі дзяржаўны дзеяч, але трывала замацаваў у слоўніку слова «ёлуп хвашчоўскі» для вызначэння чагосьці дурнога і бескарыснага».*

«Ёлупа хвашчоўскага» Караткевіч згадвае і ў сваіх іншых творах. Нядаўна здзейснілася мая даўняя мара: я на свае вочы пабачыла таго «ёлупа». Народны выраз утварыўся ад драўлянай скульптуры святога Сімпліцыяна, што дасюль стаіць на цагляным слупе ў Фашчаўцы. «Фашчаўскі» ў гаворцы, як я разумею, ператварыўся ў «хвашчоўскі». Пра паходжанне скульптуры знайшла некалькі версій. Паводле адной, скульптуру паставілі езуіты тутэйшай місіі, калі пераносілі мошчы святога на могілкі. Паводле другой, быў такі рыцар Сімпліцыян сярод езуітаў, якія сюды прыйшлі. У любым выпадку відовішча адметнае, і дужа шкада, калі рарытэт знікне. Ужо мала што ад статуі засталося.

### Галава Машэкі

Неяк несправядліва, што так мала скульптурных увасабленняў твораў Янкі Купалы... Хоць імі можна лічыць усе варыяцыі на тэму Купалля.

Адзін з герояў, вартых, па агульным прызнанні, увасаблення — Машэка, герой аднайменнай паэмы. Купала даў свой варыянт легенды пра паходжанне Магілёва. Львоў у Магілёве поўна, а вось помнік Машэку, здаецца, пакуль адзін... Напэўна, з'явіцца і іншая скульптура, эскізы ўжо былі, а цяпер каменны помнік вышынёй у паўтара метра работы скульптара Уладзіміра Піпіна ўсталяваны на тэрыторыі колішняга замка, у парку імя Горкага. Суровы твар бязлітаснага разбойніка, ахвяры няшчаснага кахання, адпалохае любога ворага... Кажуць, помнік і сімвалізуе супрацьстаянне нападнікам.

### Палясоўшчык Тарас

*«Чуць золак —*
*стрэльбу ён за плечы,*
*Заткне сякеру*
*за пояс, —*
*Заўсёды ходзіць*
*бор сцярэгчы*
*Ды птушак біць*
*з ружжа Тарас».*

У Гарадку аматары цікавостак шукаюць помнік палясоўшчыку Тарасу, герою паэмы «Тарас на Парнасе». Паэма лічылася ананімнай, пакуль даследчык Генадзь Кісялёў не ўстанавіў: яе аўтар — Кастусь Вераніцын, ураджэнец Гарадокшчыны, які і вучыўся тут, у Гарадку. Бронзавая выява героя, зробленая віцебскімі скульптарамі Іванам Казаком і Сяргеем Сотнікавым, нагадвае і самога Вераніцына.

Са скульптурай, праўда, атрымаліся мітрэнгі. Яе ўсталёўвалі двойчы: першы раз да абласных «Дажынак», потым на нейкі час прыбралі з-за непаразуменняў з аплатай, потым ізноў усталявалі... Цяпер скульптура — цэнтр свята «Гарадоцкі Парнас» і галоўная мясцовая адметнасць.

### Шура Балаганаў

Шмат гарадскіх скульптур, утульных, гарэзных, з'явілася на Беларусі ў апошнія гады. Сярод іх — помнік герою рамана Ільфа і Пятрова «Залатое цяля» Шуру Балаганаву ў Бабруйску. Чаму раптам? А дзякуючы любові прафесійнага махляра Балаганава да гэтага горада. Прайдзісветы, што выдавалі сябе за дзяцей рэвалюцыйнага лейтэнанта Шмідта і пазычалі грошы ў даверлівых савецкіх чыноўнікаў, дзялілі тэрыторыю. Цытата пра гэта ўпрыгожвае помнік:

*«— Нашли дураков! — визгливо кричал Паниковский. — Вы мне дайте Среднерусскую возвышенность, тогда я подпишу конвенцию.*

*— Как, всю возвышенность? — заявил Балаганов. — А не дать ли тебе еще Мелитополь впридачу? Или Бобруйск?*

*При слове «Бобруйск» собрание болезненно застонало. Все соглашались ехать в Бобруйск хоть сейчас. Бобруйск считался прекрасным, высококультурным местом».*

Нягледзячы на саркастычны падтэкст цытаты, прайдзісветы любілі правінцыйны горад за празмерную даверлівасць жыхароў — скульптуру, створаную Яраславам Барадзіным да 85-годдзя водаканала, месцічы шануюць, яна стаіць каля адрэстаўраванай водапорнай вежы ў цэнтры горада.

### Джын Гасан Абдурахман ібн-Хатаб

У Віцебску на дзень горада з'явіўся помнік Старому Хатабычу, герою папулярнай савецкай дзіцячай казачнай аповесці. Нагадаю, што Хатабыч — гэта джын, які трапляе ў рукі піянера Волькі. Тысячагадовы досвед Гасана Абдурахмана ібн-Хатаба ў новых варунках не спрацоўвае, бо піянерам не патрэбныя золата, багатыя ўборы і пакланенне. А Волька пераконваецца, што чагосьці вартыя толькі каштоўнасці, зробленыя сумленнай працай... У адрозненне ад шматлікіх Чубурашак, катоў Леапольдаў і Гулівераў, што запаланілі паркі і дзіцячыя пляцоўкі, у гэтага помніка была гістарычная падстава з'явіцца на Беларусі. У 1903 годзе ў Віцебску нарадзіўся аўтар аповесці пра піянера і джына Лазар Лагін. Яго сапраўднае імя — Лазар Гінзбург.



Хатабыча паставілі ля ўваходу ў лялечны тэатр «Лялька», аўтар помніка — віцебскі мастак, скульптар і дызайнер Сяргей Сотнікаў.

### Мюнхгаўзен, хоць і не той самы

А вось з'яўленне ў Глыбокім да 600-годдзя горада помніка герою кнігі нямецкага пісьменніка Рудольфа Эрыка Распэ «Прыгоды барона Мюнхгаўзена» — спроба містыфікацыі. Месца нечаканае, непадалёк ад старых гарадскіх могілак Копцеўка. Чаму тут вырашылі размясціць бронзавага барона-фантазёра, які, седзячы на гарматным ядры, глядзіць праз падзорную трубу на краявіды беларускага мястэчка?

Справа ў тым, што на пачатку двухтысячных тут знайшлі магілу, дзе на чыгунным крыжы па-нямецку напісана: «Фердынанд і Вільгельміна фон Мюнхгаўзен». На іншым баку крыжа значыцца: «Памёрлі 31 сакавіка 1871 года».

Прозвішча адразу абудзіла фантазію месцічаў. Ну чаму тут не можа быць пахаваны герой Распэ? Ці хоць бы яго нашчадак. І цяпер, ды яшчэ пасля з'яўлення помніка, усе экскурсанты абавязкова просяць адвесці іх на магілу барона Мюнхгаўзена. Цікаўнікаў не бянтэжыць, што сапраўдны Карл Еранім барон фон Мюнхгаўзен памёр у 1797 годзе і быў пахаваны ў родным горадзе Бадэнвердэр на захадзе Германіі. Але хто ведае, мо хтось і адшукае сувязь глыбоцкіх Мюнхгаўзенаў з тымі бадэнвердэрскімі?

Дарэчы, другі помнік барону Мюнхгаўзену, дакладней, Алегу Янкоўскаму ў гэтай ролі, аўтарства скульптара Уладзіміра Жбанава, знаходзіцца ў дворыку Музея гісторыі Мінска.

### Гуліверы, панначкі, зубры

Пералічанае, вядома, далёка не ўсё... Каля Гомельскага тэатра лялек стаіць Бураціна з іншымі героямі казкі Аляксея Талстога — работа скульптара Валерыя Кандрацэнкі. Уладзімір Жбанаў, аўтар многіх гарадскіх скульптур, падарыў нам ажно дзве чэхаўскія «Дамы з сабачкамі» — адна дама задумення мроіць аб каханні каля мінскай Камароўкі, другая — каля Магілёўскага драматычнага тэатра. У Магілёве нясе службу і бронзавы пушкінскі станцыйны наглядчык работы Жбанава — месца яму, натуральна, на вакзале. У Гродне на вуліцы Ажэшкі на гранітным пастаменце забаўляе публіку Жаба-падарожніца працы скульптара Уладзіміра Панцялеева. У Магілёве Уладзімір Конанаў стварыў паркавую скульптуру з граніту «Песнь пра зубра» і помнік «Маленькі прынц». У Оршы, у дзіцячым парку, высіцца Гулівер. У Брэсце, на вуліцы Гогаля, увекавечаныя сцэна адпявання паннaчкі з гогалеўскага «Вія», нос калежскага асэсара з апавядання «Нос», выкраданне Месяца з «Вечароў на хутары каля Дзіканькі»... І гэта далёка не поўны пералік, які, безумоўна, будзе яшчэ папаўняцца.

Падарожнічайце па роднай Беларусі, рабіце адкрыцці ў яе мастацтве і літаратуры!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Выставы

# ПРЫВІТАННЕ З МІНУЛАГА

## Да 100-годдзя ўтварэння СССР у Гродне адкрылася экспазіцыя прадметаў савецкай эпохі

**На вінтажнай выставе прадстаўлена больш за 700 экспанатаў з фондаў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага і прыватнай калекцыі гродзенскага гісторыка і краязнаўцы Аляксандра Сявенкі. Тут можна ўбачыць прадметы бытавой тэхнікі, паштоўкі, дакументы, кнігі, дзіцячыя настольныя гульні, ёлачныя цацкі і многае іншае.**

З савецкай эпохай звязана жыццё не аднаго пакалення. Для больш сталых беларусаў на перыяд СССР прыпадае значная частка жыцця, для іншых — пара дзяцінства і маладосці. А тыя, каму сёння трыццаць, вядуць свой жыццёвы адлік ужо ў самастойнай Беларусі.

І хоць савецкія часы мінулі, многія рэчы застаюцца ў нашым ужытку і цяпер. Каб апынуцца ў савецкім мінулым, дастаткова завітаць да старажылаў нашых вёсак. Праўда, зараз старыя рэчы сумяшчаюць з сучаснымі. А вінтаж, здаецца, зноў уваходзіць у інтэр'ерную моду. Прынамсі, «паляванне» на старыя рэчы вядзецца даволі актыўна.

Чым цікавыя такія рэчы? Магчыма, не толькі тым, што захоўваюць нейкія таямніцы ці рэдкія самі па сабе. На думку калекцыянера Аляксандра Сявенкі, у значнай ступені тут працуе настальгічны фактар. Гады дзяцінства, юнацтва, як правіла, згадваюцца з цеплынёй.

— У кожнай эпохі — свае плюсы і мінусы. У кожнага чалавека ў жыцці ёсць радасныя моманты і сумныя. Лёсы людзей, зразумела, перапляталіся з жыццём краіны. Замест таго, каб адмаўляцца, трэба лепш вывучаць гэта мінулае і памятаць яго, — упэўнены гродзенскі калекцыянер. — Мне захацелася нагадаць пра той час, каб моладзь пачула і пастаралася зразумець сталае пакаленне. Вядома, і з пазнавальнага боку такая выстава таксама карысная моладзі.

Большасць экспанатаў менавіта з прыватнай калекцыі. Яны захоўваюцца ў загарадным доме Аляксандра Сявенкі, дзе ў яго нават створаны невялікі музей. Цяпер экспазіцыя размешчана ў аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі. Па словах супрацоўніцы бібліятэкі Юліі Макарчык, такім чынам установа вырашыла адгукнуцца на 100-гадовы юбілей першай у свеце Савецкай сацыялістычнай



дзяржавы, дата стварэння якой прыпадае на 30 снежня 1922 года.

У першую чаргу бібліятэкар звяртае ўвагу на цуд савецкай тэхнікі канца 1950-х гадоў — камбінаваную радыётэлевізійную ўстаноўку «Беларусь-5». У адным корпусе спалучаюцца чорна-белы тэлевізар, радыёпрыёмнік, вінілавая радыёла, узмацняльнік і калонкі. Да гэтага апарата меўся нават пульт дыстанцыйнага кіравання. Вядома, дазволіць такую тэхніку сабе маглі не многія. Тым не менш выставачны экзэмпляр калекцыянер набыў у вясковых жыхароў. Некаторыя заможныя вяскоўцы набывалі тэхнічныя навінкі літаральна адразу пасля таго, як у вёсцы праходзіла электрыфікацыя. Старажылы могуць прыгадаць, як на прагляд тэлепраграм у доме збіраліся не толькі ўсе члены сям'і, але і сваякі і аднавяскоўцы.

Найбольш папулярным відам бытавой тэхнікі былі на той час радыёлы. Меў такую і дзед калекцыянера. Яна захавалася да гэтай пары і прадстаўлена ў якасці экспаната. Некалькі стэлажоў займаюць патэфоны і грамафоны, пласцінкі, якія былі папулярныя ў 1970—1980-я, бабінныя і шпулькавыя магнітафоны, пераносны тэлевізар, радыёпрыёмнікі. Напрыклад, чорна-белы пераносны транзістарны тэлевізар «Электроніка ВЛ-100» важыў усяго 2,8 кілаграма. Яго выпуск быў прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння У. Леніна. А вось самым цяжкім экспанатам з'яўляецца сеткавая радыёла «Мінск-58». Яна складаецца з лямпавага радыёпрыёмніка з унутранай магнітнай антэнай і электрапрайгравальніка для пласцінак. Такая радыёла важыць ажно 18 кілаграмаў.

Сучасным дзецям будзе цікава на свае вочы пабачыць кінапраектар «Русь» і дыяпраектар «Пеленг 500 АФ», якія прызначаны для прагляду кінафільмаў, а таксама слайдаў і дыяфільмаў. А калісьці аб такіх тэхнічных цудах марылі многія падлеткі, а шчаслівыя ўладальнікі кінакамеры і самі спрабавалі сябе ў ролі рэжысёраў.

На выставе можна таксама ўбачыць, як выглядаў савецкі камп'ютар — ПВК — персанальны вылічальны комплекс. Ён быў распрацаваны ў расійскім Варонежы на заводзе «Працэсар» і там жа серыйна выпускаўся з 1985 года. Да яго далучалася клавіятура. Манітор быў і чорна-белы, і каляровы.

А вось прадзедам ПВК можна лічыць арыфмометр «Феликс». Гэта настольная механічная вылічальная машына для дакладных арыфметычных аперацый. Прыбор названы ў гонар рэвалюцыйнага дзеяча Фелікса Дзяржынскага. Гэтая мадэль выпускалася з 1929 да 1978 года.

Асобны стэлаж прысвечаны выданням, якія адлюстроўваюць усю палітычную эпоху СССР. Гэта кнігі Леніна, Сталіна, Хрушчова, Брэжнева, Гарбачова і іншых савецкіх дзеячаў. Дарэчы, у экспазіцыі ёсць і зборнік артыкулаў Леніна, які выйшаў у 1924 годзе. Як вядома, у гэтым годзе не стала кіраўніка краіны Саветаў, старшыні СНК.

Наглядным дапаможнікам для вывучэння гісторыі СССР могуць быць настольныя медалі, маркі, паштоўкі, друкаваная прадукцыя, значкі. Многія з іх адлюстроўвалі менавіта савецкую эпоху і самыя значныя падзеі.

Арганізатары лічаць, што выстава можа быць цікавая як падрастаючаму пакаленню, так і тым, каму давялося жыць у той перыяд. Своеасаблівая машына часу перанясе наведвальніка на дзесяцігоддзі назад, у СССР, які стаў ужо гісторыяй.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Сваё. Роднае

# У НАВАГОДНІМ ЗАЛЮСТРОЎІ

**З кожным днём подых Новага, 2023, года адчуваецца ярчэй. Хтосьці ўжо паспеў упрыгожыць галоўны сімвал свята — лясную прыгажуню — пацеркамі, шарыкамі і гірляндамі, а тым, хто яшчэ знаходзіцца ў ідэйных пошуках, раю зазірнуць па навагодняе натхненне ў Заронаўскі музей, дзе сабрана адна з самых вялікіх у Беларусі навагодніх калекцый.**



Штогод народны комплексны музей «Гісторыя Заронаўскага краю», што ў Віцебскім раёне, напярэдадні навагодніх свят становіцца абласным цэнтрам навагодняга настрою, і нездарма, бо менавіта тут захавальніца музейных каштоўнасцяў Людміла Нікіціна больш чым за 30 гадоў сабрала звыш дзвюх тысяч экспанатаў: навагодніх цацак і ўпрыгожванняў, паштовак і дзядоў марозаў. Прасачыць гісторыю станаўлення свята Новага года ад самага пачатку і да сённяшніх дзён можна за паўгадзіны, дакрануўшыся да кожнага гістарычнага артэфакта.

### Драўляны Дзед Мароз і яго калегі

Белабародых чараўнікоў на музейнай паліцы сёння каля 60 штук: розныя знешне і па памерах, але аднолькавых няма. З ваты, гумовыя, з цыраты і нават драўляны — кожная з цацак унікальная, з асабістай гісторыяй. Напрыклад, драўлянага дзеда прынеслі ў музей у не вельмі прывабным стане наведвальнікі, аднак з лёгкай рукі Станіслава Нікіціна цацка набыла свой першапачатковы выгляд і стала ў экспазіцыі цэнтральным аб'ектам увагі. Дарэчы, рэстаўрацыі патрабуюць многія прадметы, якія з цягам часу згубілі сваю прыгажосць, але не згубілі каштоўнасць, таму захавальнікі музейных каштоўнасцяў з авантурызмам падклейваюць і фарбуюць казачных герояў, даючы ім другое жыццё. Многія наведвальнікі, якія даўно сталі сябрамі музея, перадаюць у калекцыю дзядоў марозаў сваёй сям'і, на якіх вырасла не адно пакаленне.

Побач з дзядамі на паліцы размясціліся снягуркі. Цікавы факт: толькі ў рускага Дзеда Мароза ёсць памочніца — іншыя замежныя чараўнікі ходзяць да дзяцей адны. Акрамя звычайных гумовых цацак, у калекцыі прадстаўлена Снягурачка ў футры з рамонкаў, а спадніцу ўнучкі ўпрыгожваюць галінкі туі.

Каля нашага белавалосага чараўніка знайшлі прапіску і замежныя госці: Санта Клаус, французскі Пэр-Наэль, фінскі Ёўлупукі, Наталі з Апенінскага паўвострава, якая хадзіла да дзяцей не з падарункамі, а з розгамі і лупцавала непаслухмяных.

### Гісторыя ў шклярусе

У 1935 годзе ў СССР аднавілі святкаванне Новага года, таму першыя ёлачныя цацкі былі самаробнымі, у нязвыклай для нас форме. Спачатку садавіну і гародніну, а пасля жывёл дзеці рабілі разам з бацькамі з ваты і клею: з дроту скручвалі каркас будучай цацкі, пасля слой за слоем наносілі вату, у некаторых выпадках для бляску дадавалі шклярус. Менавіта гэтыя першыя цацкі па сёння застаюцца ўнікальнымі, выраблёнымі ў адзіным экзэмпляры.

Пры Мікіце Хрушчове на ёлках з'явілася шкляная садавіна і гародніна, а цэнтральнае месца, вядома, адводзілася царыцы палёў — кукурузе. Пасля выхаду фільма «Карнавальная ноч» у кожным доме на зялёныя галінкі вешалі гадзіннікі, якія спыніліся на «без пяці хвілін 12». Іх у музейнай калекцыі каля дзесяці, ёсць мініяцюрныя і вялікія. Кожная знакавая падзея ў краіне знаходзіла адлюстраванне ў ёлачных упрыгожваннях: пасля палёту Юрыя Гагарына ў космас з'явіліся фігуркі касманаўтаў, дырыжабляў і касмічных караблёў. Шышкі, якія ў савецкі час былі неад'емным навагоднім элементам, прадстаўлены на музейнай паліцы шырока: розных колераў і формы, ад самых маленькіх да такіх, якія не змяшчаюцца ў далоні (такія, як правіла, упрыгожвалі гарадскія ёлкі).

Прыцягваюць увагу наведвальнікаў цацкі інтэрнацыянальнай тэматыкі, а яшчэ — казачныя персанажы Аляксандра Пушкіна, выпушчаныя да 150-годдзя з дня нараджэння паэта. Прадстаўлены і шкляныя сімвалы мінулых навагодніх свят.

### Ёлкі і паштоўкі

Як жа абысціся без галоўнага сімвала Новага года — ёлкі? Іх у калекцыі больш за дзесяць, кожная адметная не толькі выглядам, але і матэрыялам. Каляровыя прыгажуні з макароны і гароху, з сурвэтак, фаціну, цукерак, папяровых трубачак, тканіны і так званыя «ёлкі-тапатушкі».

«Некаторыя з гэтых самаробных ёлачак рабіла вучні былой Заронаўскай школы, ім ужо звыш дзесяці гадоў. Асобныя дрэўцы дорадць сябры музея і наведвальнікі, якія вяртаюцца да нас зноў і зноў. Унікальнасць гэтых твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва заключаецца не толькі ў бязмежнай фантазіі майстроў, але і ў энергетыцы — дзіцячай і дарослай», — расказвае Людміла Нікіціна.

А галоўную савецкую ёлку экспазіцыі са срэбнымі галінкамі ўпрыгожваюць саламяныя цацкі-павучкі, якія па беларускіх павер'ях збіралі ў сябе ўсю негатыўную энергію, што назапашвалася ў хаце.

У багатай калекцыі паштовак, якія трапілі ў Беларусь напрыканцы XIX стагоддзя, ёсць асобнікі, датаваныя 1912, 1916, 1919 гадамі. Унікальныя сярод іх — паштоўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1942-1943 гадоў, навагоднія, прысвечаныя артыстам і зоркам эстрады, дзяржаўным святам.

Галоўнай адметнасцю Заронаўскага музея з'яўляецца магчымасць узяць кожны прадмет у рукі і сфатаграфавацца — адным словам, дакрануцца да сведкаў гісторыі. Таму і едуць сюды няспынна зацікаўленыя турысты, каб зарадзіцца навагоднім настроем і адчуць подых чарговага Новага года.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**
**Больш фота на сайце**
**zviazda.by**

Спорт-тайм

# БІЯТЛАНІСТЫ ЗАВАЯВАЛІ НАВАГОДНІЯ МЕДАЛІ

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем самыя цікавыя навіны



**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** У Разані ў біятлонным комплексе «Алмаз» завяршыўся трэці этап Кубка Садружнасці, удзел у якім прынялі спартсмены Беларусі і Расіі. У жаночым суперспрынце пераможцай стала беларуская біятланістка Дзінара Алімбекава. На чатырох агнявых рубяжах яна дапусціла толькі адзін промах. У мужчынскім суперспрынце перамога тақсама дасталася беларускаму спартсмену — Івану Тулаціну. На другім месцы Антон Смольскі, які ўступіў партнёру па камандзе чатыры секунды. У мужчынскім мас-старце беларус Мікіта Лобастаў заняў трэцяе месца.

Чацвёрты этап Кубка Садружнасці па біятлоне пройдзе з 19 па 22 студзеня ў Раўбічах.

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Валейбалісты салігорскага «Шахцёра» пяты раз сталі ўладальнікамі Кубка Беларусі. У вырашальным паядынку 32-га кубкавага розыгрышу падапечныя Віктара Бекшы перамаглі мінскі «Будаўнік» з лікам 3:2, у матчы за бронзавыя ўзнагароды віцебскі клуб «Марка-ВДТУ» ўзяў верх над абухоўскім «Легіёнам» з вынікам 3:1. Уладальніцамі Кубка Беларусі сярод жанчын сталі валейбалісткі брэсцкага «Прыбужжа», якія ў фінале перайгралі шматразовых чэмпіёнак краіны валейбалістак «Мінчанкі» — 3:0.

**НЯЎДАЧА ТЫДНЯ.** Гандбалісты мужчынскай зборнай Беларусі пацярпелі паражэнне ў другім таварыскім матчы ў Бахрэйне. Беларусы ўступілі гаспадарам з лікам 27:30. Самым выніковым у складзе нашай зборнай аказаўся Мікіта Вайлупаў, які закінуў 11 мячоў. Ён жа з 13 галамі быў найлепшым снайперам і ў першай гульні, якую беларускія гандбалісты ўпэўнена выйгралі з вынікам 33:28.

Зборная Бахрэйна з'яўляецца сярэбраным прызёрам чэмпіянату Азіі і зараз рыхтуецца выступіць на чэмпіянаце планеты, які ў студзені 2023 года прымуць Польшча і Швецыя.

**РЭКОРД ТЫДНЯ.** Сяргей Заслаўскі, чэмпіён свету па сілавых відах спорту, трохразовы майстар спорту міжнароднага класа па жыме штангі стоячы і па класічным пад'ёме на біцэпс, устанавіў чарговы рэкорд. Атлет завяршыў 2022 год новым дасягненнем у вагавой катэгорыі да 85 кг, выціснуўшы стоячы штангу ў 120 кг. Рэкорд краіны зафіксаваны суддзямі міжнароднай катэгорыі, і зараз Сяргей Заслаўскі афіцыйна стаў наймацнейшым атлетам Беларусі ў сілавых відах спорту. У канцы верасня беларускі асілак пабіў дасягненне амерыканца Роберта Нэльсана ў жыме 70-кілаграмовай штангі: за 60 секунд ён здзейсніў 21 пад'ём — на адзін больш, чым было ў амерыканскага спартсмена. У 2023 годзе беларус настройваецца на новыя рэкорды.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** У Смаленску прайшоў Кубак Расіі па фехтаванні, сярод удзельнікаў якога і беларускія спартсмены. Фехтавальшчыкі разыгралі медалі ў асабістым і камандным першынствах у трох відах зброі. Беларуская спартсменка Кацярына Пашарнёва прайшла сваю частку турнірнай сеткі без паражэнняў, у чвэрцьфінале перамагла Хрысціну Ясінскую з каманды Маскоўскай вобласці (15:12), а ў паўфінале справілася з масквічкай Янай Бекмурзавай (15:14). Саперніцай беларускі па фінале стала двухразовая чэмпіёнка свету Таццяна Гудкова. Кацярына ў гэтым паядынку заваявала «серабро». Вынік сустрэчы — 15:11.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.53 | 7.25 |
| Віцебск — | 9.26 | 16.35 | 7.09 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.43 | 7.25 |
| Гомель — | 9.06 | 16.48 | 7.42 |
| Гродна — | 9.42 | 17.10 | 7.28 |
| Брэст — | 9.34 | 17.19 | 7.45 |

## Месяц

*Маладзік 23 снежня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр.* *Калініка, Мікалая, Філімона.*
*К.* *Жанэты, Максіма, Тодара, Цэзара, Яна.*



Фота Настассі ГРУК.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 27 СНЕЖНЯ

У краіне

**1862** год — на тэрыторыі Беларусі пачаў эксплуатавацца ўчастак чыгуначнага пуці з Пецярбурга ў Варшаву. Яго адрэзак Парэчча — Гродна стаў першай чыгуначнай лініяй, пракладзенай на беларускай зямлі.

**1912** год — нарадзіўся (г. Чэрвень) Уладзімір Адамавіч Кароль, беларускі архітэктар, заслужаны будаўнік Беларусі, народны архітэктар СССР, правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР. Асноўныя работы ў Мінску (у суаўтарстве): праект планіроўкі і забудовы Ленінскага (цяпер Незалежнасці) праспекта, будынкі Галоўпаштамта, манумент Перамогі. Адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1919** год — нарадзілася Галіна Кліменцьеўна Макарава, беларуская савецкая, актрыса тэатра і кіно. Народная артыстка СССР.

**1923** год — нарадзіўся (в. Машканы Сенненскага раёна) Анатоль Вялюгін, паэт, кінадраматург, перакладчык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы і Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Аўтар паэтычных зборнікаў «Зара займаецца», «Песня зялёнага дуба», сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Генерал Пушча», «Балада пра маці» і іншых.

**1942** год — пачалася аперацыя нямецка-фашысцкіх захопнікаў пад кодавай назвай «Зімовы лес». Яна была накіравана супраць партызан і цывільнага насельніцтва ў Віцебскім, Гарадоцкім, Мехаўскім, Полацкім, Сіроцінскім раёнах Віцебскай вобласці. Праводзілася з мэтайператварэння тэрыторыі ў тыле левага крыла групы армій «Цэнтр» у зону «выпаленай зямлі». Пасля кровапралітных баёў большасці партызанскіх фарміраванняў удалося прарвацца праз чыгунку Полацк — Невель і вывесці з сабой у Расонскі раён тысячы мясцовых жыхароў. У ходзе аперацыі гітлераўцы знішчылі 1627 чалавек мірнага насельніцтва, 2041 чалавека вывезлі на катаржныя работы ў Германію, поўнасцю спалілі вёскі Аржавухава, Белае, Чарбамысль з большасцю жыхароў, захапілі шмат жывёлы і сельскагаспадарчай прадукцыі.

У свеце

**537** год — урачыста асвечаны Сабор святой Сафіі ў Канстанцінопалі.



**1571** год — нарадзіўся Іаган Кеплер, нямецкі матэматык і астраном, першаадкрывальнік законаў руху планет.

**1822** год — нарадзіўся Луі Пастэр, французскі мікрабіёлаг і хімік, заснавальнік сучаснай мікрабіялогіі і імуналогіі. Распрацаваў метад прафілактычнай вакцынацыі некаторых захворванняў. Увёў метады асептыкі і антысептыкі.

**1831** год — Чарльз Дарвін на караблі «Бігль» адправіўся ў вандраванне, падчас якога ён сфармуляваў тэорыю эвалюцыі.

**1832** год — нарадзіўся Павел Міхайлавіч Траццякоў, рускі купец, калекцыянер, заснавальнік Траццякоўскай галерэі ў Маскве. Правадзейны член Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Ганаровы грамадзянін Масквы. З 1854 года збіраў мастацкую калекцыю, з 1856-га — творы рускага мастацтва, якія паклалі пачатак Траццякоўскай галерэі. У 1892 годзе перадаў увесь свой збор у дар гораду Маскве.

**1979** год — у Афганістан па просьбе кіраўніцтва гэтай краіны ўведзены савецкія войскі (знаходзіліся да 15 лютага 1989 г.). За 10 гадоў вайны загінула больш як 15 тысяч савецкіх ваеннаслужачых, у тым ліку каля 800 чалавек з Беларусі.

Так гаварыла...

**АГАТА КРЫСЦІ:**

*«Па-сапраўднаму любіць той, каго меней любяць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Заўважыў нейкую заканамернасць: што чым даўжэй жывеш, тым больш назваў лекаў ведаеш...**

Не страшна, калі робіць з мухі слана. А вось слон пад мухай сапраўды небяспечны.

**— Дзяўчына, можна я вас сфоткаю? Хачу паслаць Дзеду Марозу, што я жадаю на Новы год...**

Пасля навагодняга карпаратыву дырэктар фірмы пагадзіўся аплаціць супрацоўніцам наведванне семінара «Як аднавіць жанчыне сваю рэпутацыю ў калектыве пасля карпаратыву».

**— Як сустрэў Новы год?**
**— Ёсць, што ўспомніць. А ты?**
**— Ёсць, што лепш не ўспамінаць.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3091.
Нумар падпісаны ў 19.30 26 снежня 2022 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12